

АДПАЧЫНАК...
У КУКУРУЗЕ

Сямейная газета

ЯК ЭКАНОМНА
САБРАЦЬ ДЗІЦЯ
Ў ШКОЛУ

Сямейная газета



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

15 ЖНІЎНЯ 2024 г. ЧАЦВЕР № 158 (30292)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Наталля ЧАРАПОВІЧ, спецыяліст упраўлення арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю:**

*«Сёння інтэрнэт-гандаль уваходзіць у лік асноўных кропак росту эканомікі ў многіх развітых краінах. Беларусь, дзе гандаль таксама даўно ўвайшоў у інтэрнэт-прастору і надзейна там замацаваўся, не выключэнне. Усё больш людзей з кожным годам схіляецца да пакупак пэўных таварных груп праз інтэрнэт. Грашовы аб'ём такіх пакупак, як і іх колькасць, няўхільна расце. Па стане на 1 жніўня, у гандлёвым рэестры Беларусі зарэгістравана 30 279 інтэрнэт-магазінаў. У параўнанні з колькасцю, зафіксаванай у рэестры на пачатак года, прырост склаў 367 адзінак, ці 1,2 %».*

# ХТО ШУКАЕ — ТОЙ ЗНАХОДЗІЦЬ



Фота БелТА.

**Экспедыцыя Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі пад кіраўніцтвам кандыдата гістарычных навук Алега ДЗЯРНОВІЧА *(на фота)* сумесна з ТАА «Белрэстаўрацыя» праводзяць археалагічныя даследаванні Крэўскага замка. Каля Малой брамы вядуцца пошукі слядоў апор моста, які забяспечваў доступ з варот у двор замка. Археолагі ўжо знайшлі пласт з артэфактамі XVII стагоддзя.**

## КОРАТКА

- Забароны на наведванне лясоў дзейнічаюць у шасці раёнах Беларусі.
- **За студзень — чэрвень 2024 года рэнтабельнасць рэалізаванай прадукцыі, тавараў, работ, паслуг склала 8,1 працэнта, рэнтабельнасць продажаў — 6,7 працэнта.**
- Мінскі аўтамабільны завод урачыста перадаў 80 адзінак тэхнікі юбілейнай серыі дылерам з Беларусі і Расіі.
- **Аграрыі сабралі больш за 7,2 млн тон збожжа з улікам рапсу.**
- Уезду ў Еўрасаюз чакае больш за тысячу легкавушак.

ISSN 1990 — 763X

Сацыяльны клопат

## НОВЫ ГОД ПРЫНЯСЕ НОВЫЯ ДАПАМОГІ

**З 1 студзеня 2025 года зменіцца заканадаўства па пытаннях дзяржаўнай падтрымкі сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей. Пра навацыі расказала намеснік начальніка ўпраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Святлана КОВАЛЬ.**



Асноўны блок змяненняў датычыцца дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў. З наступнага года права на назначэнне дапамогі на дзяцей, старэйшых за тры гады, набудуць тыя сем'і (з асобных катэгорый), дзе дзіця-інвалід дасягнула ўзросту 18 гадоў і ў сям'і яшчэ выхоўваюцца непаўналетнія дзеці.

— Калі дзіця-інвалід дасягае ўзросту 18 гадоў, яму ўстанаўліваецца І група інваліднасці і адзін з бацькоў ажыццяўляе яго догляд, і на гэты перыяд будуць выплачвацца дапамогі на іншых непаўналетніх дзяцей, старэйшых за тры гады, — адзначыла Святлана Коваль.

СТАР. 4

Працяг тэмы

## КВАТЭРНАЕ ПЫТАННЕ

### Як, прадаючы сваю нерухомасць, не страціць нервы і грошы

**Гэтай гісторыяй узаемадзеяння з адным сталічным агенцтвам нерухомасці падзяліліся з чытачамі «Звязды» Эльвіра КРАСНОВА, яе дачка Ганна (прадаўцы кватэры) і Анастасія ДРАЗДОВІЧ, якая набывала гэты аб'ект. Жанчыны спадзяюцца, што іх расповед дапаможа іншым пазбегнуць сітуацыі, у якую яны трапілі.**

Аб тым, што дзейнасць па аказанні дапамогі ў заключэнні здзелак з нерухомасцю патрабуе высокай кваліфікацыі, нашы гераіні даведаліся занадта позна. Анастасія — калі страціла кватэру, а Эльвіра і Ганна — атрымалі павестку ў суд...




Фота носіць ілюстрацыйны характар.

СТАР. 13

Медыяпрастора

# Як супрацьстаяць тэхналагічным гігантам?

## У ІНФАРМАЦЫЙНАЙ ПРАСТОРЫ НАС НЕ ПАКІНУЦЬ У СПАКОІ

**На гэтым на сустрэчы з ідэалагічным актывам Мінскай вобласці акцэнтаваў увагу намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір ПЯРЦОЎ.**



Падобныя канструктыўныя сустрэчы ўжо прайшлі ў Гомелі і Брэсце. У Магілёве адбыўся Форум медыйнай супольнасці. «Яго ўдзельнікі пачулі планы, пасылы кіраўніка дзяржавы, якія датычацца арганізацыі інфармацыйнай і ідэалагічнай работы, а таксама контрпрапаганды, — адзначыў Уладзімір Пярцоў. — Я думаю, што многія з вас маюць негатыўны вопыт 2020 года і пазітыўны вопыт выбудоўвання новай інфармацыйнай ідэалагічнай парадыгмы на сваёй тэрыторыі. Мы разумеем, што калі дзесьці праспім, то ўсе нашы вакуумы, якія ўтвараюцца, будуць імгненна запоўненыя тымі людзьмі, якіх ужо нельга назваць альтэрнатыўнай журналістыкай. Гэта цалкам адназначна, як мінімум, тэндэнцыйная прэса, як максімум — праява цэнтраў інфармацыйна-псіхалагічных спецыяльных аперацый, якія пераследуюць пэўныя мэты ў інтарэсах дзяржаў і спецыяльных службаў, што іх утрымліваюць».

Паводле яго слоў, менавіта на ідэалагічным актыве ляжыць задача тлумачыць людзям правілы інфармацыйнай гігіены, расказваць пра тое, якія рызыкі і небяспекі тояць інтэрнэт, новыя медыя і медыяпадобныя структуры. «Сёння нам супрацьстаіць эфектыўная, высокатэхналагічная, багатая машына, — папярэдзіў Уладзімір Пярцоў. Гэта не наіўныя хлопчыкі і дзяўчынкі, а тэхналагічныя гіганты з недружалюбных краін. Імі кіруюць карпарацыі і людзі, якія пераследуюць глабальныя геапалітычныя і эканамічныя мэты ў дачыненні да ў цэлым калектыўнага Усходу, не толькі нашай краіны. Яны выкарыстоўваюць гэтыя лічбавыя магчымасці як інструмент, як транспарт па данясенні той інфармацыі, як інструмент па данясенні сваіх геапалітычных стратэгічных мэт. Наіўна да гэтага ставіцца нельга».

З плюсаў — работа, якая апошнім часам праведзена дзяржаўнымі органамі нашай краіны. «Толькі за мінулы год Міністэрства інфармацыі абмежавала доступ да 3388 дэструктыўных рэсурсаў. Многія з іх — гэта люстэрка дэструктыўных рэсурсаў. Тут структура досыць шматслаёвая. Гэта і продаж наркотыкаў, і парнаграфія, і рэсурсы, якія рэкрутуюць і распавядаюць аб розных экстрэмісцкіх фарміраваннях. Гэта і прапагандысцкія дэструктыўныя экстрэмісцкія рэсурсы, і шматлікія праявы ў інтэрнэце медыяпадобных, так званых мімікравальных пад журналістыку аўтараў, якія выконваюць сваю функцыю ўздзеяння на тыя колы нашай аўдыторыі, якія не вызначыліся, альбо лаяльныя, альбо якія думаюць некалькі інакш», — падагульніў Уладзімір Пярцоў.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ,**
**фота аўтара.**

Эканоміка

# КЛЮЧАВЫЯ ЗАДАЧЫ — ЭКСПАРТ І ІНВЕСТЫЦЫІ

## На пасяджэнні Савета Міністраў разгледзелі сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны ў першым паўгоддзі

**Прэм'ер-міністр Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА адзначыў, што вынікі студзеня — чэрвеня ў цэлым нядрэнныя. З пяці найважнейшых паказчыкаў эфектыўнасці работы ўрада і Нацыянальнага банка выкананы чатыры. Пяты — экспарт — недавыкананы зусім крыху.**



Фота БелТА.

Кіраўнік урада паведаміў, што за першае паўгоддзе ВУП Беларусі вырас на 5 % пры прагнозе 3 %. Ва ўсіх абласцях і Мінску забяспечаны рост валавога рэгіянальнага прадукту. Заданне выканалі ўсе рэгіёны, за выключэннем Гомельскай вобласці, дзе паказчык склаў 102,1 % пры заданні 102,8 %. Таксама ён канстатаваў, што высокія тэмпы росту забяспечаны ў прамысловасці (107,1 %), сельскай гаспадарцы (109,7 %), будаўніцтве (108,8 %) і гандлі (111 %).

— Дзякуючы прыманым намі сумесна з Нацыянальным банкам мерам у краіне забяспечваецца і макраэканамічная стабільнасць. Усе расходныя абавязацельствы бюджэту сацыяльнага характару выконваюцца своечасова і ў поўным аб'ёме. Сітуацыя на валютным рынку ўстойлівая, расце давер насельніцтва да нацыянальнай валюты. З пачатку года ўклады грамадзян у беларускіх рублях выраслі на 1,4 мільярда рублёў, або на 17,5 працэнта», — адзначыў прэм'ер-міністр.

Ён таксама дадаў, што за мінулы перыяд золатавалютныя рэзервы павялічыліся на $400 млн і на 1 жніўня склалі $8,5 млрд. Інфляцыя знаходзіцца ў рамках прагнозу: у чэрвені да снежня яе ўзровень склаў 3,4 % пры заданні не больш як 3,9 %.

Працягваючы тэму, **міністр эканомікі Юрый ЧАБАТАР** заначыў: дзякуючы таму, што інфляцыя знаходзіцца ў межах прагнозных параметраў, у краіне павялічваюцца рэальныя даходы насельніцтва: за разгледжаны перыяд рост склаў 9 %, а сярэдняя заработная плата перавысіла дзве тысячы рублёў. Усё гэта дазваляе ў тым ліку падтрымліваць унутраны попыт. Міністр падкрэсліў, што расце рознічны таваараабарот. Таксама ён звярнуў увагу на папулярнасць у насельніцтва крэдытнага прадукту на айчынныя тавары — мэблю, бытавую тэхніку...

Адзначыў Юрый Чабатар і ключавыя задачы, якія стаяць перад рэальным сектарам эканомікі. У першую чаргу гэта інвестыцыйная дзейнасць.

— Мы працуем з рэгіёнамі, іншымі міністэрствамі па дапаўненні ініцыятыў у сферы рэалізацыі інвестыцыйных праектаў. Гэты кірунак у пастаяннай дынаміцы. Змянілася якаснае напаўненне інвестыцый: істотна прырастае доля ўкладанняў у машыны і абсталяванне, тобок у актыўную частку, у тое, што дае непасрэдны эфект на прадпрыемствах у плане павышэння канкурэнтаздольнасці і прадукцыйнасці працы, — праінфармаваў кіраўнік эканамічнага ведамства.

Другі важкі кірунак дзейнасці — экспарт, у тым ліку і на новыя рынкі. Сёлета прадпрыемствы краіны істотна нарасцілі аб'ёмы паставак у краіны далёкай дугі. Тым не менш, па словах міністра, патрабаванні да іх не змяншаюцца, трэба і надалей працаваць у гэтым кірунку як мага больш інтэнсіўна.

Адзначыў ён і дарэмнасць асцярог наконт перагрэву эканомікі — яе ўзровень не выходзіць за межы нормы, а Мінэканомікі кантралюе параметры, якія выходзяць у чырвоную зону, і аператыўна, разам з рэгулятарамі, прымае рашэнні па нармалізацыі становішча.

**Паводле БелТА.**

Падрабязнасці

# «Пры той забяспечанасці, якую мы маем, адмоў для людзей не будзе»

## У МІНЛЯСГАСЕ ПАТЛУМАЧЫЛІ ЗМЯНЕННІ Ў ПАРАДКУ РЭАЛІЗАЦЫІ ДРАЎНІНЫ

**Як мы паведамлялі ва ўчарашнім нумары, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 13 жніўня падпісаў Указ № 323, якім уносяцца змяненні ва Указ ад 23 лістапада 2020 года № 437 «Аб вядзенні лясной гаспадаркі і рэалізацыі драўніны». Дакументам даецца права юрыдычным асобам, якія вядуць лясную гаспадарку і падпарадкоўваюцца Кіраўніцтву спраў Прэзідэнта, ажыццяўляць рэалізацыю фізічным асобам дзелавой драўніны ў нарыхтаваным выглядзе па-за біржавымі таргамі па цэнах арганізацый-вытворцаў для будаўніцтва або рамонту жылых дамоў і гаспадарчых пабудоў. Раней, згодна з Указам № 437, такі механізм продажу быў прадугледжаны толькі для арганізацый Мінлясгаса.**

**Намеснік міністра лясной гаспадаркі Уладзімір КРЭЧ растлумачыў, чаму ў Беларусі змянілі ўмовы рэалізацыі дзелавой драўніны насельніцтву.**

«Змяненні ў першую чаргу закранулі дапаўненне механізма рэалізацыі ў нарыхтаваным выглядзе лесу для фізічных асоб. Гэты механізм, па сутнасці, ужо дзейнічае, але толькі для лясгасаў, падпарадкаваных Мінлясгасу. У рамках маніторынгу гэтага механізма Камітэтам дзяржаўнага кантролю былі выяўлены пэўныя недапрацоўкі, і, зразумела, яны былі агучаны кіраўніку дзяржавы. У выніку намі падрыхтаваны змяненні, якія сёння даюць магчымасць скарыстацца такім механізмам яшчэ і юрыдычным асобам, нацпаркам, падпарадкаваным Кіраўніцтву спраў Прэзідэнта», — адзначыў Уладзімір Крэч.

Увага з боку Камітэта дзяржкантролю была звязана са зваротамі грамадзян, якія не маглі атрымаць драўніну па гэтым механізме на пэўных тэрыторыях, дзе якраз і знаходзяцца лясы пад юрысдыкцыяй Кіраўніцтва спраў. У прыватнасці, у Нацыянальны парк «Браслаўскія азёры» Віцебскай вобласці, які сёння займае даволі значныя плошчы, звярнуліся грамадзяне для атрымання драўніны па такім механізме. Юрыдычна яны не мелі права адпусціць гэту драўніну, і людзям давялося звяртацца ў найбліжэйшы лясгас — Верхнядзвінскі. «Для іх гэта ўсё роўна атрымлівалася больш выгадна, чым атрымаць драўніну з нацпарка па прэйскурантных цэнах біржы. Але зноў жа за кошт лагістыкі гэта нязручна для нашага насельніцтва. Цяпер людзі ўжо спакойна змогуць звярнуцца ў любую ўстанову, вядучую лясную гаспадарку, падпарадкаваную Кіраўніцтву спраў Прэзідэнта, і па тым жа механізме набыць гэту драўніну», — патлумачыў намеснік міністра.

Уладзімір Крэч нагадаў аб механізме рэалізацыі драўніны ў нарыхтаваным выглядзе. Сёння фізічныя асобы маюць права звярнуцца ў любы лясгас, а цяпер ужо і ў лесагаспадарчую ўстанову, падпарадкаваную Кіраўніцтву спраў, для атрымання драўніны без біржавых таргоў па цэнах прадпрыемства-вытворцы, гэта значыць па мінімальных цэнах з рэнтабельнасцю не больш як пяць працэнтаў ад сабекошту. На цяперашні момант такая цана вагаецца ад Br70 да Br100 за кубаметр у залежнасці ад дыяметра. Гэта практычна ў два разы ніжэй, чым біржавыя каціроўкі на Беларускай універсальнай таварнай біржы.

Такая драўніна выдзяляецца па канкрэтных мэтавых прызначэннях. Напрыклад, для будаўніцтва жылых дамоў і надворных пабудоў. «Для гэтага павінен быць пэўны пакет дакументаў. Працэдура поўнасцю рэгламентавана, і людзі яе разумеюць. Не трэба хадзіць па некалькіх інстанцыях, усё ажыццяўляецца літаральна на тэрыторыі лясгаса. На працягу дня ўсё можна аформіць. Такі ж механізм цяпер распаўсюджваецца і на юрыдычных асоб Кіраўніцтва спраў Прэзідэнта», — расказаў Уладзімір Крэч.

Таксама ўказам удакладнены аб'ёмы рэалізацыі дзелавой драўніны. Цяпер гэта да 70 куб. м на кожны аб'ект будаўніцтва або аднаўлення (раней — у сукупнасці на ўсе аб'екты) і да 10 куб. м для бягучага рамонту адзін раз у рамках каляндарнага года ў сукупнасці на ўсе аб'екты (раней — па 10 куб. м на кожны аб'ект — жылы дом, дачу, садовы дом). «Для бягучага рамонту таксама неабходны невялікі камплект дакументаў аб тым, што чалавек валодае гэтай нерухомай маёмасцю, якая зарэгістравана, мы заключаем дагавор, і па той жа льготнай цане выдзяляецца драўніна», — адзначыў ён.

Уладзімір Крэч падкрэсліў, што гэты механізм паказаў сваю эфектыўнасць. «За 2023 год намі заключана больш чым 5,1 тысячы дагавораў з фізічнымі асобамі і адпушчана каля 97 тысяч куб. м драўніны. Гэта на мэтавае прызначэнне менавіта за мінулы год, калі КДК праводзіў маніторынг. Па выніках 2023 года і з'явіліся рэкамендацыі па дапаўненні пераліку юрыдычных асоб, — паведаміў намеснік міністра. — Сёння мы бачым, што, па меры таго як нашы людзі карыстаюцца гэтым механізмам, попыт расце. Ужо за сем месяцаў бягучага года маем больш за тры тысячы заключаных дагавораў. Рост у рамках года складзе каля 15 працэнтаў. Значыць, людзі разумеюць ужо гэты механізм, ён распаўсюджваецца і актыўна выкарыстоўваецца. Ён зручны, а самае галоўнае — запатрабаваны».

Абмежаванняў па выдзяленні неабходных аб'ёмаў драўніны не будзе, падкрэсліў Уладзімір Крэч. «Пры той забяспечанасці, якую мы маем, адмоў для людзей не будзе. Тым больш мы прадугледзелі, што нават калі не хапае фонду аблвыканкама, які ў першую чаргу выкарыстоўваецца для забеспячэння фізічных асоб сыравінай, мы можам выкарыстоўваць усе віды высечак, якія не забаронены заканадаўствам. Кожны будзе забяспечаны драўнінай», — рэзюмаваў ён.

**Паводле БелТА.**

Глабальны кантэкст



# АБМЕНУ ПАДЛЯГАЮЦЬ...

## Любыя праблемы, нават самыя вострыя, можна вырашыць шляхам перагавораў

**1 жніўня 2024 года ў сталіцы Турцыі Анкары на тэрыторыі аэрапорта Эсенбог адбыўся абмен асуджанымі паміж Расіяй і Захадам. Міжнародная юрыдычная здзелка закранула лёс 26 чалавек, з якіх 16 былі адпраўлены ў ЗША і Еўропу, а дзесяць вярнуліся ў Расію. Гэтая неардынарная падзея, якая стала «хітом» інфармацыйнага парадку, датычылася і Рэспублікі Беларусь.**

Не выклікае сумнення, што падобныя мерапрыемствы загадзя і старанна рыхтуюцца, а асобы, уключаныя ў спісы абмену, уяўляюць істотную цікавасць для бакоў-удзельнікаў. Станоўчы вынік — гэта рэальны поспех спецслужбаў і цэлага шэрагу міністэрстваў. У той жа час гэта дэманстрацыя гатоўнасці абараняць уласных грамадзян і здольнасці знаходзіць для гэтага кампраміснныя рашэнні ў самых складаных умовах міжнароднай абстаноўкі.

Складанасць ажыццёўленай аперацыі ўзаемнага абмену асуджанымі заключалася ў тым, што яны ўтрымліваліся ў турмах ЗША, Германіі, Польшчы, Славеніі, Нарвегіі, Расіі і Беларусі. Усё гэта патрабавала дакладнай каардынацыі намаганняў і сінхронных дзеянняў урадаў усіх уцягнутых краін. Вынікам стала паспяховае вызваленне васьмі расіян з заходніх турмаў, адпраўка іх і дваіх непаўналетніх дзяцей у Маскву. У сваю чаргу, 16 экс-зняволеных з'ехалі ў Берлін і Вашынгтон (13 і 3 адпаведна).

З боку Захаду ў спісы трапілі трое расіян (В. Канашчонак, В. Клюшын, Р. Селязнёў), асуджаных у ЗША на розныя тэрміны па абвінавачваннях у: набыцці і пастаўцы Расіі «адчувальнай амерыканскай электронікі і боепрыпасаў для садзейнічання ваенным намаганням Расіі і распрацоўцы зброі ў парушэнне экспартнага кантролю ЗША», рэалізацыі злачынных схем па ўзломе камп'ютарных сістэм прыватных кампаній, выкрадáнні іх канфідэнцыяльных даных і здзяйсненні банкаўскага махлярства. Характэрна, што ўсе яны былі затрыманы па-за тэрыторыяй ЗША па запыце Вашынгтона, экстрадзіраваныя і асуджаныя амерыканскай Фемідай.

З еўрапейскіх турмаў былі вызвалены: Ганна і Арцём Дульцавы, якія адбывалі пакаранне ў Славеніі за шпіянаж; журналіст Павел Рубцоў (Гансалес), затрыманы ў Польшчы па падазрэнні ў шпіянажы; Міхаіл Мікушын, арыштаваны ў Нарвегіі; Вадзім Красікаў, асуджаны ў Германіі па справе аб ліквідацыі былога чачэнскага палявога камандзіра Зелімхана Хангашвілі.

Па сутнасці, большасць вернутых расійскіх грамадзян сумленна выконвалі абавязак перад сваёй краінай, абараняючы яе нацыянальныя інтарэсы ў розных кутках свету. У сваю чаргу, Радзіма зрабіла ўсё магчымае для іх вызвалення.

Крыху інакш выглядае гісторыя іспанскага журналіста Паўла Рубцова (Пабла Гансалеса), які мае двайное грамадзянства і з'яўляецца пазаштатным супрацоўнікам газет Publico і La Sexta. Ён знаходзіўся пад вартай у Польшчы без судовага прыгавору на працягу амаль трох гадоў ва ўмовах строгага рэжыму, прымянення да яго катаванняў і адмовы ў судовым разглядзе. У дачыненні да іспанскага журналіста былі парушаны палажэнні Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека і Еўрапейскай канвенцыі па правах чалавека, ён быў арыштаваны і ўзяты пад варту без прад'яўлення якіх-небудзь доказаў, выстаўленых супраць яго абвінавачанняў, і без перспектывы судовага разбору.

Гансалес утрымліваўся ў турме ў горадзе Радам (для асабліва небяспечных злачынцаў). У турэмнай камеры без вокнаў ён знаходзіўся 23 гадзіны ў суткі, а выходзіць дазвалялася толькі на адну гадзіну на прагулку.

Нягледзячы на неаднаразовыя звароты Міжнароднай і Еўрапейскай федэрацыі журналістаў і іх іспанскіх філіялаў з заклікамі да польскіх улад перагледзець статус П. Гансалеса і вызваліць яго, даўшы яму магчымасць абараняць сябе ў судзе і забяспечыць справядлівы судовы разгляд, Варшава не прымала ніякіх мер.

Уключэнне іспанскага журналіста ў спісы абмену варта расцэньваць не інакш, як акт міласэрнасці з боку Расіі ў адносінах да ўласнага грамадзяніна, які незаконна ўтрымліваўся за мяжой, і крайнюю меру, накіраваную на ліквідацыю юрыдычнага беззаконня. У сувязі з гэтым верхам крывадушнасці выглядаюць словы Д. Байдэна і О. Шольца аб тым, што абмененыя зняволеныя «бязвінныя» і «палітычна ангажаваныя». І гэта гавораць лідары «дэмакратычнага» свету, дзе судовае рашэнне — гэта вярхоўны закон.

Каб не быць галаслоўным, звернемся да фактаў і больш падрабязна разгледзім персанальны склад адпраўленых на Захад асоб, памілаваных прэзідэнтамі Беларусі і Расіі.

Пачаць варта з нямецкага грамадзяніна Рыка Крыгера, прыгаворанага ў Беларусі да расстрэлу па прыгаворы Мінскага абласнога суда 24 чэрвеня 2024 года. Віна гэтага злачынца была даказана па шасці артыкулах Крымінальнага кодэкса, сярод якіх: наёмніцтва, агентурная дзейнасць, акт тэрарызму, стварэнне «экстрэмісцкага фарміравання», незаконныя дзеянні ў дачыненні да агнястрэльнай зброі і выбуховых рэчываў, наўмыснае прывядзенне ў непрыдатнасць транспартнага сродку або шляхоў зносін.

У выніку яго дзейнасці 5 кастрычніка 2023 года было ўзарвана чыгуначнае палатно на станцыі Азярышча і толькі па шчаслівай выпадковасці абышлося без людскіх ахвяр. Тэрарызм у чыстым выглядзе для любой юстыцыі. Аднак і ў дачыненні да Крыгера былі выкананы ўсе палажэнні Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека: праведзены расследаванне, судовы разбор, вынесены прыгавор, які ён не абскардзіў. Сцвярджэнне «невінаваты» ў дачыненні да дадзенага персанажа проста недапушчальнае.

*Рашэнне аб памілаванні і перадача асуджанага Германіі — гэта яркі акт міласэрнасці з боку нашага Прэзідэнта А. Р. Лукашэнкі. «Закон строгі, але ён Закон» — гэтая ісціна нараўне са справядлівасцю з'яўляюцца асновамі для нашага грамадства, што Беларусь у чарговы раз прадэманстравала ўсяму свету.*

Што датычыцца іншых удзельнікаў абмену, то, акрамя Крыгера, чацвёра мелі нямецкае грамадзянства. Сярод іх — асуджаныя за дзяржаўную здраду Кевін Ліка, Дэмуры Варонін, Герман Мойжэс і Патрык Шэбель, які адбываў тэрмін за кантрабанду наркатычных сродкаў.

З траіх перададзеных на захад амерыканцаў — два прафесійныя разведчыкі (Эван Гершковіч і Пол Уілан), узятыя з доказамі злачынства на тэрыторыі Расіі, а адна (Алсу Курмашова) — актыўны ўдзельнік працэсу падрыву расійскай дзяржаўнасці. Усе яны былі асуджаныя на розныя тэрміны зняволення ў адпаведнасці з законам.

Характэрна, што сярод прапанаваных Захадам для абмену персон больш чым палова адносяцца да прадстаўнікоў расійскай палітычнай і мастацкай багемы, якія актыўна выступаюць супраць канстытуцыйнай улады і з'яўляюцца агентамі ўплыву. Гэта грамадзяне Расіі: Уладзімір Кара-Мурза (і Вялікабрытаніі); паплечнікі нябожчыка Навальнага Ілья Яшын, Ксенія Фадзеева, Лілія Чанышава, Вадзім Астанін; Андрэй Півавараў, Алег Арлоў, Аляксандра Скачыленка. Усе гэтыя персанажы здзейснілі злачынствы, былі асуджаныя, адбывалі пакаранне ў папраўчых установах і ветліва прыняты Германіяй.

Трэба адзначыць, што ўжо на нямецкай зямлі Ілья Яшын і Уладзімір Кара-Мурза далі прэс-канферэнцыю, на якой паведамілі, што ім не выдалі расійскіх замежных пашпартоў. Яшын заявіў: «Тое, што са мной адбылося першага чысла, я не разглядаю як абмен, я разглядаю гэтае мерапрыемства менавіта як незаконнае выдварэнне з Расіі супраць маёй волі». Ён адзначыў, што напісаў заяву на імя начальніка СІЗА «Ляфортава», у якой адмовіўся даць згоду «на высылку за межы Расіі».

Абмен, які адбыўся, актыўна выкарыстоўваўся на Захадзе для дэманізацыі Расіі і вырашэння ўласных палітычных задач. У Вашынгтоне траіх памілаваных зняволеных сустракалі Д. Байдэн і К. Харыс. Каля трапа самалёта ў аэрапорце Кёльна канцлер О. Шольц заявіў, што вырашальным фактарам для нямецкіх улад стала тое, што ў іх «ёсць абавязацельства абараняць грамадзян Германіі, а таксама салідарнасць са Злучанымі Штатамі». Пры гэтым ён не прамінуў адзначыць, што сустракае «невінаватых асоб, пазбаўленых волі і несправядліва затрыманых па палітычных матывах у Расіі... А ўрад Германіі будзе працягваць змагацца за вызваленне ўсіх, хто знаходзіцца ў турмах Расіі і Беларусі па палітычных прычынах».

Не менш красамоўныя былі Жазеп Барэль, які заявіў, што «Еўрапейскі саюз з палёгкай успрыняў вызваленне і перадачу на волю, за межы Расіі і Беларусі шэрагу палітычных зняволеных», і Йенс Столтэнберг, які абвясціў, што «гэта дасягненне стала магчымым дзякуючы НАТА».

Не пакінула без увагі гэтую падзею і Міжнародная праваабарончая арганізацыя Amnesty International, паведаміўшы пра пэўны «прысмак горычы» ў сувязі з абменам: «Забойца і іншыя злачынцы, асуджаныя справядлівым судом, цяпер выходзяць на волю ў абмен на людзей, якія проста скарысталіся сваім правам на свабоду выказвання думак». У чарговы раз ангажыраванасць і перакручванне фактаў. Мала таго што за кожнага расійскага грамадзяніна перададзены па два асуджаныя, дык яшчэ тэрарысты і экстрэмісты ўзведзены ў ранг «нявінных ахвяр».

Разам з тым, што б ні сцвярджалі прыхільнікі «заходніх каштоўнасцяў», найбуйнейшы з часоў халоднай вайны абмен зняволенымі адбыўся. Людзі вярнуліся на Радзіму, дадому, да ўласных сем'яў, і гэта галоўнае дасягненне, якое стала рэальнасцю дзякуючы канструктыўнай пазіцыі прэзідэнтаў Расіі і Беларусі. Можна па-рознаму трактаваць паняцці «свабода» і «правы чалавека», называць кагосьці разведчыкам, а кагосьці шпіёнам, але не варта ігнараваць магчымасці дыпламатыі і закрываць каналы камунікацыі.

Нашы краіны ў чарговы раз прадэманстравалі ўсяму свету, што гатовы да раўнапраўнага дыялогу і кампрамісу, калі гэта ідзе на карысць людзям. Практычна любыя праблемы, нават самыя вострыя, могуць быць вырашаны за сталом перагавораў, але для гэтага патрэбны ўзаемная воля і зацікаўленасць.

Можна прытрымлівацца любых палітычных поглядаў, але не варта забываць, што ў свеце няма нічога больш каштоўнага, чым чалавечае жыццё. Магчыма, менавіта гэта можа стаць адным з галоўных прынцыпаў новага шматпалярнага свету, які фарміруецца на нашых вачах.

**Мікалай БУЗІН,**
**старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў,**
**прафесар.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Прэм'ер-міністр Японіі заявіў аб планах пакінуць сваю пасаду



Прэм'ер-міністр Японіі Фуміа Кісіда пацвердзіў, што пакіне пасаду кіраўніка ўрада пасля выбараў старшыні кіручай у краіне Ліберальна-дэмакратычнай партыі (ЛДП). Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на экстранную прэс-канферэнцыю ў рэзідэнцыі палітыка. Кісіда прыняў рашэнне аб адмове вылучаць сваю кандыдатуру на выбарах на фоне падзення рэйтынгаў урада да рэкордна нізкага ўзроўню з-за шэрагу скандалаў, у першую чаргу звязаных з парушэннямі правілаў фінансавай справаздачнасці пры зборы палітычных ахвяраванняў у ЛДП. Па звестках агенцтва Kyodo, ён заявіў сваім паплечнікам аб жаданні ўзяць на сябе адказнасць за гэты скандал, таму што «нехта павінен гэта зрабіць». Кісіда таксама паабяцаў падтрымліваць новага лідара.

## Колькасць затрыманых у Вялікабрытаніі з-за беспарадкаў перавысіла тысячу чалавек

Аб гэтым РІА «Новости» паведамілі ў прэс-службе Нацыянальнага савета начальнікаў паліцыі (NPCC). Як вядома, напрыканцы ліпеня масавыя пратэсты ўспыхнулі ў многіх гарадах Вялікабрытаніі пасля нападзення 17-гадовага падлетка з нажом на дзяцей у Саўтпарце. Тады трое малых загінулі, яшчэ некалькі дзяцей і двух дарослых даставілі ў бальніцу ў крытычным стане. На фоне беспарадкаў улады Вялікабрытаніі тройчы склікалі надзвычайны ўрадавы камітэт COBRA. Прэм'ер краіны Кір Стармер паабяцаў узмацніць паліцэйскую прысутнасць на вуліцах брытанскіх гарадоў, паскорыць крымінальнае судаводства, а таксама пераследаваць вінаватых у распальванні беспарадкаў у сацсетках. У мінюсце паведамілі, што для супрацьдзеяння гвалту вызвалілі дадаткова 500 месцаў у турмах і задзейнічалі шэсць тысяч супрацоўнікаў спецыялізаваных аддзелаў паліцыі.



## Сістэму all inclusive ў Турцыі зноў прапанавалі перагледзець



Прадстаўнікі турэцкай індустрыі турызму зноў прапануюць перагледзець папулярны сярод замежнікаў фармат «усё ўключана» (all inclusive) у атэлях. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на газету Hurriyet. Выданне прыводзіць меркаванне бізнесмена Зафера Алкая, які быў адным з заснавальнікаў гэтай сістэмы ў 1990-х гадах. Аднак на працягу апошніх гадоў ён выступае за яе змяненне, адзначае газета. Паводле яго слоў, гэтая сістэма стала важнай у развіцці турызму краіны, аднак праз гады яе неабходна абмеркаваць нанава. Прадстаўнікі індустрыі турызму Турцыі раней неаднаразова выступалі з прапановамі перагледзець фармат all inclusive.

Уражанні

# «ВЯРШЫНЯ БУДАЎНІЧАЙ ДУМКІ!»

## У ПАЛАЦЫ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ — БУДАЎНІКІ І МАШЫНАБУДАЎНІКІ





**У цёплы летні дзень 14 жніўня ў Палацы Незалежнасці прайшлі ажно дзве экскурсіі. Так, з самай раніцы яго гасцінныя дзверы адчыніліся перад прадстаўнікамі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, а пасля абеду інтэр'еры палаца здзіўлялі і натхнялі работнікаў «Белкамунмаша».**

Для будаўнікоў і архітэктараў гэтая экскурсія стала своеасаблівым падарункам да прафесійнага свята, якое яны адзначылі 11 жніўня. Напярэдадні ў іх яшчэ адна значная дата: у канцы месяца міністэрства адсвяткуе сваё 30-годдзе. Вельмі крануальна, што падчас экскурсіі ў шматлікіх дэталях палаца яны пазнавалі менавіта сваю работу.

У другой палове дня працаўнікі «Белкамунмаша» таксама з вялікай цікавасцю разглядалі элементы інтэр'ера палаца, рабілі фота на памяць і даведваліся шмат новага, цікавага. Намеснік генеральнага дырэктара па ідэалагічнай, сацыяльнай рабоце і кіраванні персаналам Ірына Вязіцкая падзялілася, што яны даўно хацелі трапіць на гэту экскурсію. Ахвотных было вельмі шмат, выбіралі найлепшых з найлепшых.

— У нас існуе практыка заахвочваць тых, хто паказвае высокія вытворчыя вынікі, і тых, хто прадстаўляўся да пэўнага віду ўзнагарод. Да таго ж мы вырашылі, што абавязкова трэба ўзяць сюды моладзь, каб у іх было разуменне, у якой краіне жывём і для чаго працуем. А тут, уласна, ёсць усё: і найноўшыя дасягненні, і прыгажосць, і тэхналогіі. Адным словам, вяршыня будаўнічай думкі! — заключыла яна.

Атрымалася нам паразмаўляць і з прадстаўнікамі маладога пакалення. Дзмітрый Гайковіч і Анастасія Дубовік працуюць у адным падраздзяленні і дакладна ведаюць, колькі кіламетраў жгутоў у кожным тралейбусе. Наведванне Палаца Незалежнасці з самага пачатку выклікала яркія эмоцыі ў маладых людзей.

— Мае ўражанні можна апісаць адным словам: «Вау!». Гэта проста найлепшае месца, у якім я быў, — падзяліўся Дзмітрый.

— Я вельмі рада, што ў нас ёсць такая пляцоўка, якую ў тым ліку могуць наведаць і простыя беларусы. Глядзіш на гэта ўсё і ганарышся краінай, пераконваешся ў тым, што ў нас усё вельмі прыгожа, не горш, чым у іншых, — дапоўніла Анастасія.

А для вядучага інжынера-тэхнолага Кацярыны Яцкевіч экскурсія ў Палац Незалежнасці ўвогуле была марай.

— Апынуўшыся тут у год ужо трыццацігоддзя інстытута Прэзідэнцтва, у поўнай меры адчуваеш, як далёка наша краіна ступіла наперад у развіцці, якая ў нас высокатэхналагічная вытворчасць і, самае галоўнае, якія ў нас таленавітыя і працавітыя людзі, — падзялілася яна.

Паводле слоў Кацярыны, у гэтым месцы адчуваецца асабістае дачыненне да гістарычнага мінулага і сучаснасці. Гэта нядзіўна, бо па ўсім інтэр'еры Палаца Незалежнасці праходзіць беларускі арнамент і матыў слуцкіх паясоў, ды і наша сучасная гісторыя вяршыцца менавіта ў гэтых сценах.





**Лізавета ГОЛАД,**
**фота аўтара.**

# НОВЫ ГОД ПРЫНЯСЕ НОВЫЯ ДАПАМОГІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сёння дапамога сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, старэйшых за тры гады, выплачваецца чатыром катэгорыям сем'яў: тым, якія выхоўваюць дзіця-інваліда да 18 гадоў; дзе ёсць ВІЧ-інфікаванае дзіця; калі бацька з'яўляецца ваеннаслужачым тэрміновай ці альтэрнатыўнай службы; калі бацькі з'яўляюцца інвалідамі I ці II групы (ці поўныя сем'і, дзе адзін з бацькоў — інвалід I групы, а другі ажыццяўляе яго догляд). Такім чынам, з першага студзеня наступнага года да гэтых катэгорый далучацца і сем'і, у якіх дзіцяці-інваліду споўнілася 18 гадоў, але пры выкананні пэўных умоў.

— Для атрымання гэтага віду дапамогі патрабуецца занятасць бацькі (у поўнай сям'і) або аднаго з бацькоў (у няпоўнай сям'і) не менш за шэсць месяцаў у папярэднім годзе і на момант падачы заявы. Адзначу, што з 1 студзеня 2025 года ў занятасць будзе ўключацца таксама перыяд, у які бацькі не працавалі па ўважлівых прычынах. Напрыклад, у сувязі з хваробай, калі гэты перыяд будзе пацверджаны даведкай арганізацыі аховы здароўя. Прызначаецца такая дапамога тэрмінам на адзін каляндарны год, — растлумачыла спецыяліст.

Акрамя таго, наваўвядзеннем стане і прадастаўленне бацькам права на атрыманне ўсіх відаў дзяржаўных дапамог у перыяд кароткатэрміновага знаходжання дзіцяці-інваліда ў Доме дзіцяці падчас аказання яму платнай паслугі медыка-сацыяльнай дапамогі (да 56 каляндарных дзён у год). Цяпер гэтая дапамога не выплачваецца.

Яшчэ адна навела па прызначэнні дапамог на дзяцей, старэйшых за тры гады, з асобных катэгорый сем'яў — выплаты на дзяцей, якія не з'яўляюцца інвалідамі і якія пасля заканчэння школы навучаюцца ў навучальнай установе на платнай аснове не толькі за кошт уласных сродкаў сям'і, але і ў іншых выпадках. Напрыклад, калі навучанне аплачвае арганізацыя па месцы работы бацькоў.

Згодна са змяненнямі, бацькам, якія не працуюць і даглядаюць дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, дадзена магчымасць пераналучання. Яны праз службу занятасці змогуць бясплатна перавучыцца і атрымаць новую прафесію, прычым без страты выплаты дапамогі і стажу.

Навацыяй стане і тое, што ў бацькоў будзе права на атрыманне дапамогі па часовай непрацаздольнасці па догляде дзіцяці-інваліда на перыяд яго санаторна-курортнага лячэння, медыцынскай рэабілітацыі, калі ў сям'і некалькі дзяцей-інвалідаў. У такіх выпадках прапануецца прадастаўляць яе іншай асобе (не другому з бацькоў), калі адзін з бацькоў заняты доглядам іншага свайго дзіцяці-інваліда, або дзве дапамогі, калі абодва дзіцяці-інваліды ў адзін перыяд маюць патрэбу ў санаторным лячэнні, рэабілітацыі і іх суправаджаюць розныя асобы. Сёння калі маці і бацька дзіцяці-інваліда ці дваіх дзяцей-інвалідаў на бальнічны могуць прэтэндаваць толькі бацькі. З пачаткам дзеяння норм закона такое права даецца іншым сваякам ці членам сям'і.



Святлана Коваль нагадала таксама, што з ліпеня гэтага года ўступіла ў дзеянне яшчэ адно істотнае змяненне ў заканадаўства аб падтрымцы сем'яў з дзецьмі. Датычыцца яно паслуг няньні. Да 1 ліпеня такія паслугі аказваліся бясплатна ў рамках 20 гадзін у тыдзень (4 гадзіны ў дзень). З 1 ліпеня сем'ям, у якіх выхоўваюцца два дзіцяці-інваліды, такая паслуга будзе прадастаўляцца на 40 гадзін у тыдзень — паўнацэнны працоўны дзень. Аднак яе атрыманне магчыма пры ўмове, што дзеці не наведваюць установы адукацыі ці навучаюцца дома.

**Алена КРАВЕЦ.**

Сямейная газета
Выпуск № 14 (239)

Думкі ўслых

# ЯБЛЫК... АД ЯБЛЫНІ

*Было гэта даволі даўно, але помніцца і па сёння.*

*Да той прыдарожнай кавярні (кіламетраў за 50 ад Адэсы) мы пад'ехалі першымі, навюсенькая чорная «мазда» — следам.*

*Нам пашчасціла: занялі асобны столік — апошні.*

*Пажылы кіроўца «мазды» мог паехаць далей. Але ж не — падышоў, ветліва спытаў дазволу падсесці...*

*— Вы з Беларусі? — удакладніў. — А я там вырас...*

*Пакуль чакалі афіцыянта, пакуль палуднавалі, быў час пагаварыць. Дакладней — паслухаць нашага застольніка і даведацца, што яго бацькі пазнаёміліся на прымусовых работах у Германіі. Што іх, гэтых работ, была проста цемра, а вось ежы — хіба на панюх. Таму бацька — высокі, шырокі ў касцях — з голаду літаральна апух, амаль не ўставаў і хацеў памерці. Але Бог прыслаў беларусачку — худзенькую, маленькую... Ёй, жартавала, як птушцы — толькі б папіць, а ежы не трэба. І таму ці не ўвесь свой паёк яна аддавала... Бацька выжыў.*

*Пасля вызвалення ён прывёз дзяўчыну дамоў, ва Украіну. Яны пажаніліся, зажылі — як амаль усе тады: без свайго кутка, без грошай, а найгорш, што ў хуткасці — з дзецьмі, без дзіцячых садкоў.*

*Двух большых унукаў па магчымасці сталі забіраць да сябе ўкраінскія дзед з бабуляй, а яго, маленькага, прывезлі ў Беларусь.*

*З таго, што запомніў (на ўсё жыццё)... Дзед вострыць рыдлёўку: сама гэта жалезіна і яго пяцірня — аднаго памеру. Потым яны садзяць ябльыню — каля самай вуліцы, і дзед прыгаворвае, што вось будзе нейкі чалавечак ехаць ці ісці — нарве сабе яблыкаў, пачастуецца. Ці, можа, ад дажджу схаваецца — адпачне. Карацей — яму, таму чалавечку, вельмі добра будзе.*

*Зноў жа з дзедам — заўсёды ўдваіх — яны спускаюць бярозавы сок і носяць яго ў склеп, каб потым ці не ўсіх, хто будзе праходзіць па вуліцы, частаваць халодным кваском. Смаката надзвычайная!..*

*Як і ўсё, што еў у дзяцінстве.*

*Раніцай, напрыклад, яны з дзедам таркавалі бульбу (малы ў дзве рукі падаваў), потым — качалі клёцкі ці проста аддавалі бабулі, а яна ўжо рабіла бабку. Калі часта есці яе (дзядуля казаў) — будзеш дужы, як мядзведзь. Таму гэту страву малы называў «мядзведзем» і досыць часта прасіў згатаваць.*

*На ўсё жыццё запомніў і пахі — зваранай у печы капусты, супу з сушанымі грыбамі, хлеба. І мелодыю калыханкі пра коцю на плоце, якую спявалі то бабуля, то дзед.*

*Помніў, што яны ўвесь час працавалі — у калгасе і дома: даглядалі агарод, гаспадарку (і найбольш усё малое: куранят-гусянят, парасят, цялятак). Помніў, як вучылі яго дабрыні і адказнасці: грэх было некага не пакарміць, грэх не пагладзіць...*

*Помніў, як хвалілі яго, як казалі: «Расці вялікі!» — і ён разумеў, што гэта не столькі ростам, а яшчэ і сілай ды розумам.*

*Помніў, як часам сварыліся — на яго, на ката, на каня: «Каб табе добра было!», «Каб цябе качкі стапталі!», «Каб цябе камар убрыкнуў!»*

*А мацерных слоў не чуў.*

*І наогул...*

*Той наш сусед па століку на развітанне прызнаўся, што ўсім самым светлым, самым лепшым у жыцці абавязаны Беларусі і бацькам свaёй маці. Менавіта ад іх, ад дзядулі з бабуляй, ад той яблынькі пры дарозе — яго жаданне заўсёды нешта рабіць і ўвага да іншых: рысы, якія потым дазволілі зрабіць неблагую кар'еру.*

*Менавіта ад дзеда — павага і спагада да жанчыны, дзякуючы чаму пашчасціла стварыць моцную сям'ю, выгадаваць траіх прыгожых дзяцей, семярых унукаў і цяпер ужо ад праўнукаў (на жаль, не беларусаў) чуць перад сном: «Дзед, давай калыханку «Спяць машыны ў гаражы...»*

*Словы той, свaёй самай першай, «пра коцю на плоце», у памяці нашага знаёмца, на жаль, не засталіся. Толькі мелодыя, галасы...*

*Але ж нават іх часам дастаткова, каб годна пражыць жыццё.*

**Валянціна ДОЎНАР.**

Тыя, хто побач

# Аддаць сэрца людзям

**ПРАЦОЎНЫ стаж віцебскай сям'і медыкаў Украінец — больш за 160 гадоў. Сёння аб гэтай дынастыі ведаюць далёка за межамі Віцебскай абласной клінічнай бальніцы. Алена і Станіслаў перанялі любоў да медыцыны ад сваіх бацькоў, якія ўсё жыццё аддалі хірургіі. За працоўныя гады літаральна праз рукі сужэнцаў прайшлі тысячы пацыентаў, і яны нястомна працягваюць лячыць тых, каму патрэбна дапамога.**

Тата Алены Віктар Васільевіч быў выдатным хірургам, сапраўдным майстрам сваёй, можна сказаць, ювелірнай справы. На працягу доўгіх гадоў узначальваў Віцебскую абласную клінічную бальніцу. Менавіта жыццёвы прыклад бацькі і стаў для Алены вырашальным падчас выбару будучай прафесіі, іншых варыянтаў у гэтай сям'і быць не магло.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*



Алена і Станіслаў з сынамі Косцем і Мішам.

Спецыяльны рэпартаж

# НЕЗВЫЧАЙНАЕ ПАДАРОЖЖА ПА КУКУРУЗНЫМ ЛАБІРЫНЦЕ

## Парк «Кукуполіс» — выдатнае месца для адпачынку ўсёй сям'і

**КУКУРУЗНЫ лабірынт, які знаходзіцца ў Дзяржынскім раёне Мінскай вобласці, пачаў новы сезон аграквэстаў. Гэта даволі цікавае месца адпачынку для ўсёй сям'і. Кожны сезон аблічча лабірынта змяняецца і ўскладняецца. Так, сёлета на плошчы велічынёй у некалькі футбольных палёў зроблены заблытаныя сцяжынкі ў форме казы. Кукурузны лабірынт мае некалькі ўзроўняў складанасці. Тут сем'і правяраюць сябе на спрыт, хуткасць і спартыўнае арыентаванне. Карэспандэнты «Сямейнай газеты» таксама вырашылі выпрабаваць сябе.**



Адміністратар кукурузнага лабірынта Галіна ВАЎЧАНІНА.

У квэсце па кукурузным лабірынце можна ўдзельнічаць як аднаму, так і з камандай. Узор карты дэталёва адлюстравалі ў спецыяльнай праграме, потым па міліметрах рабілі сцяжынкі, каб дакладна паўтарыць задуманую ідэю. Пасля праходжання лабірынта гасцям аграпарку прапануюць паўдзельнічаць у іншых забаўках, а яшчэ паспрабаваць экапрадукты, пагуляць у настольныя гульні і пазнаёміцца з насельнікамі «Кукуполіса». Падрабязней пра гэта распавяла **кіраўнік фермерскай гаспадаркі «ДАК» Дзяржынскага раёна, адміністратар кукурузнага лабірынта Галіна ВАЎЧАНІНА.**

***— Галіна Эдуардаўна, кукурузны лабірынт — гэта сапраўды ўнікальнае і адзінае ва ўсёй Беларусі месца. Раскажыце, калі ласка, з чаго ўсё пачалося?***

— Сам праект лабірынта нарадзіўся раптоўна. Але выпадковасцяў не бывае, таму ў нас усё атрымалася. Тады яшчэ малады студэнт захацеў зрабіць унікальны лабірынт. Ён шукаў месца, але яму ўсе адмаўлялі. Майму мужу спадабалася гэтая ідэя. Стварыўшы кукурузны лабірынт на базе нашай гаспадаркі, мы не толькі прынеслі радасць сем'ям, але і сталі папулярызаваць сваю прадукцыю. Шмат каму спадабалася гэтае месца, і нават у будныя дні сюды масава прыязджаюць адпачываць сем'і, дзеці бегаюць, радуюцца. Ды і іх бацькі задаволеныя і шчаслівыя.

Дарэчы, кукурузны лабірынт існуе ўжо восьмы сезон. Кожны год стараемся здзіўляць новай яго карцінкай. Мы старанна рыхтуемся і выразаем яе. На жаль, яе можна ўбачыць толькі з вышыні птушынага палёту. Сёлета ў нас вяршыня лабірынта зроблена ў форме казы з рознымі ўзорамі.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*

# КАПЕЙКА РУБЕЛЬ БЕРАЖЭ,

## або Збіраем дзіця ў школу эканомна



**ШТОГАДОВЫЯ зборы ў школу патрабуюць ад бацькоў немалых намаганняў і значных матэрыяльных выдаткаў. Ці можна сэканоміць калі не першае, дык хоць бы другое? Будзем разбірацца.**

У Міністэрстве антыманапольнага рэгулявання і гандлю падлічылі, што сёлета арыенціровачны сярэдні кошт камплектаў адзення дзелавога стылю і абутку для школьнікаў складае ад 120 да 620 рублёў. І дэталізавалі: прыкладны кошт адзення і абутку для малодшых класаў — ад 120 да 600 рублёў, для сярэдніх класаў — ад 180 да 580 рублёў, бацькам старшакласнікаў давядзецца выкласці ад 170 да 620 рублёў. Арыенціровачны кошт «аптымальнага набору школьна-пісьмовых і канцылярскіх прылад» складае да 270 рублёў для малодшых класаў і да 260 рублёў — для старшакласнікаў. У сталіцы Дзень ведаў абыдзецца бацькам даражэй, чым у невялікіх населеных пунктах. Так, па падліках ДА «Сталічны гандаль і паслугі», арыенціровачны кошт «аптымальнай экіпіроўкі» для малодшых класаў — 320—1200 рублёў, для старшых класаў — 390—1300 рублёў. У любым выпадку, сумы немаленькія. І пытанне эканоміі тут вельмі дарэчнае. Дык што можна зрабіць?

### ТЭОРЫЯ ЭКАНОМІІ

У нашы дні выкідваць тое, што засталося з мінулага навучальнага года, — сапраўднае марнатраўства. Таму перад вераснёўскім школьным шопінгам праводзім рэвізію: што яшчэ дапушчальна (магчыма, папярэдне адмыўшы) ужыць па прызначэнні. Пачнём з канцтавараў. Пеналы, алоўкі і фламастары, пластылін і каляровая папера, лінейкі, цыркулі і транспарціры, сціркі і тачылкі, вокладкі для кніг і сшыткаў... Калі раней вам здавалася, што прасцей усё выкінуць і купіць новенькае і чысценькае, пазбаўцеся такой ілюзіі. Па-першае, усё гэта вельмі хутка набудзе такі ж патрапаны выгляд, а па-другое, успамінаем аб адказным спажыванні — адным з трэндаў сучаснасці. Тыя ж вокладкі для кніг: новымі і глянцавымі яны будуць толькі першы школьны тыдзень. Потым на іх, хутчэй за ўсё, з'явяцца малюнкі шарыкавай ручкай, падручнікі будуць не раз падаць пад парту, і іх вокладкі перастануць быць такімі ўжо чысценькімі. Вокладкі для кніг і сшыткаў — па сутнасці, проста кляёнка, а значыць, яе можна працерці вільготнай анучкай і выкарыстоўваць у новым навучальным годзе.

Прыгожы пенал — гэта, вядома, прыемна, тым больш што сёння школьныя аддзелы прапануюць дзясяткі варыянтаў, ажно вочы разбягаюцца. Але ўлічыце высокую верагоднасць таго, што гэты самы новенькі пенал яшчэ да канца верасня будзе згублены або парваны, або ваша дзіця памяняецца пеналамі з сябрам... І гэта вам будзе шкада і страчаных ці зламаных прыгожых дарагіх ручак, і аўтаматычных алоўкаў, і такіх мілых сцірак у выглядзе экзатычных рыбак — дзіця з гэтай нагоды не разгубіцца (калі, вядома, вы не дапаможаце яму разгубіцца, аблаяўшы і нагадаўшы, што «мама грошы не малюе»). Купляючы дарагія рэчы — няхай гэта будзе новы пенал або брэндавыя красоўкі на фізкультуру, — бацькі кормяць уласных «дэманаў». У дзяцей іншыя каштоўнасці, асабліва калі гаворка ідзе аб малодшых і сярэдніх класах (у падлеткаў усё яшчэ больш складана). Дзіця можа не ацаніць дарагую рэч, затое нейкую дробязь, якая мае для яго зусім не зразумелую дарослым каштоўнасць, будзе захоўваць гадамі і перажываць аб страце, калі згубіць або зломіць. Так што пенал, калі ён яшчэ, у прынцыпе, прыдатны да ўжывання, таксама выкарыстоўваем леташні. Гэтак жа прыдзірліва аглядаем і іншыя школьна-пісьмовыя прылады. Пакінутыя чыстымі аркушы з леташніх сшыткаў адпраўляем на чарнавікі: і зялёныя насаджэнні ратуем, і чыстыя сшыткі эканомім (а калі ўжо зусім затлуміцца адказным спажываннем, то спісаныя сшыткі можна здаць у макулатуру).

Як расказалі ў канцэрне «Беллегпрам», апошнім часам бацькоўскі запыт на эканомію і разумнае спажыванне ўлічваецца пры распрацоўцы новых школьных калекцый. Многія мадэлі штаноў і спадніц маюць рэгуляваную талію (калі ўжо купляем новае, мабыць, варта выбраць менавіта такія мадэлі), прадугледжана і магчымасць для мам лёгка «адпусціць даўжыню» вырабу. Дзеці растуць хутка, нават на працягу навучальнага года — не тое што за лета — не накупішся...


Фота Аляксандры АНЦЭЛЕВІЧ.

Гэта толькі здаецца, што «канцылярка» каштуе капейкі. Па факце, набягае круглая сума, якую мы пакідаем у сямейным бюджэце. Асабліва калі дзяцей у сям'і некалькі. Дарэчы, пераход «у спадчыну» ад старэйшых да малодшых усіх гэтых падліковых палачак, нявыкарыстаных прапісяў і іншых неабходных у малодшай школе рэчаў, як і атласаў па геаграфіі-гісторыі, таксама ніхто не адмяняў.

Тое ж самае датычыцца школьнага адзення. Прыгожыя камплекты са школьных аддзелаў (ёсць сапраўды вельмі стыльныя, сёлета дызайнеры пастараліся) так і просяцца прымераць іх на ваша дзіця. І ўсё ж спыняем парыў і для пачатку дастаём леташнюю форму. Глядзім, з чаго канчаткова вырас ваш школьнік (школьніца), што ўжо безнадзейна зношана або парвана, а што яшчэ можна вымыць, адпрасаваць і рэанімаваць. Пра пераход «у спадчыну» ад старэйшых дзяцей да малодшых не зусім зношаных прадметаў школьнага гардэроба (як гэта было ў нашым дзяцінстве) таксама варта ўспомніць. Прыйдзецца прыкласці намаганні, прыводзячы гэтыя рэчы ў парадак, затое эканомія можа быць адчувальнай.



Фота Аляксандры АНЦЭЛЕВІЧ.

### УСЯГО ТОЛЬКІ «РАСХОДНІКІ»

А вы былі калі-небудзь у школьнай раздзявальні? Калі так, то, напэўна, бачылі ўсе гэтыя курткі, што выпадкова зваліліся з вешалак, абы-як засунутыя на паліцы для абутку красоўкі, забыты пад лаўкай на падлозе світар, на які ўжо паспелі наступіць... Нягледзячы на ўсе намаганні школьных гардэробшчыц, менавіта такая карціна, хутчэй за ўсё, і адкрыецца вашым вачам. Ну а ў той раздзявальні, дзе дзеці апранаюць форму на ўрок фізкультуры, вы былі?.. Там школьнікі пераапранаюцца яшчэ і спехам, за нядоўгі час перапынку... Пра што гэта я? Ды пра тое, што дарагія красоўкі вельмі хутка страцяць выгляд, а стыльнае спартыўнае адзенне на фізкультуру, набытае ў жніўні, ужо ў кастрычніку будзе выглядаць гэтак жа, як не вельмі дарагое і не вельмі стыльнае. Дзяцей не варта ў гэтым вінаваціць. А вось бацькам, каб пазбегнуць непатрэбнага марнавання нерваў і сродкаў, варта ставіцца да школьнага адзення менавіта як да «расходнікаў». З пазіцыі фразы з рэкламы: «Калі не відаць розніцы, навошта плаціць больш?». Меркаванне, што рэч тым лепшая, чым даражэйшая, неадназначнае. Часцяком мы плацім за дызайн, а не за якасць пашыву ці матэрыялу, яшчэ часцей — за брэнд. На якасці эканоміць, вядома, не варта: дзіця ж будзе насіць гэтыя рэчы штодня (школьную форму) або амаль штодня (форму фізкультурную). Але вось пераплачваць за «непаўторны дызайн», стыльны прынт або вядомы брэнд у дадзеным выпадку зусім залішне. Гэта датычыцца ў першую чаргу спартыўнай формы. Сёння спартыўнае адзенне ў модзе, прапанова вымяраецца сотнямі і тысячамі мадэляў, але ўлічвайце: фізкультура — усяго толькі адзін з урокаў. І калі ваша дзіця не вучыцца ў школе алімпійскага рэзерву, не плануе прафесійную спартыўную кар'еру і не з'яўляецца надзеяй нашай зборнай, то і спартыўнае адзенне яму цалкам падыдзе якаснае, але не брэндавае. Ну, а калі вучыцца, плануе і з'яўляецца?.. Тады тым больш у вас дастаткова выдаткаў — на прафесійную экіпіроўку, паездкі на спаборніцтвы і зборы і гэтак далей. Словам, з некалькіх якасных рэчаў выбіраем найбольш бюджэтны варыянт. З падлеткамі-старшакласнікамі, вядома, у гэтым плане бывае складана, і ўсё ж дамовіцца можна і з імі.

Ну а што да школьнага заплечніка, а таксама «зменкі» (на якую мяняюць вулічны абутак у школе) — тут галоўным (акрамя зручнасці) крытэрыем павінна выступаць надзейнасць. Бо менавіта гэтыя рэчы «рвуцца на шматкі» першымі, адзначаюць мамы «са стажам».

### АД ТЭОРЫІ ДА ПРАКТЫКІ

Закупляемся на школьных кірмашах і распродажах. Калі мы высветлілі, што канкрэтна нам трэба набыць (з улікам таго, што максімальна можна выкарыстаць з мінулага года), адпраўляемся рабіць пакупкі (якія здзяйсняем па вышэйапісаным прынцыпе «расходнікаў»). Але куды больш выгадна ісці? На думку вопытных мам і бабуль, якія не першы год збіраюць дзяцей і ўнукаў у школу, менавіта школьныя кірмашы — месца найбольш нізкіх цэн на «школьную экіпіроўку». Бо яны разлічаны на тое, каб распрадаць тавар за некалькі дзён. Невялікая эканомія тут, некалькі рублёў там — а ў выніку набягае няйдрэнная сума. Гэтым летам у Беларусі прайшло і яшчэ пройдзе мноства такіх кірмашоў (паводле звестак МАРГ, больш за 170): да 5 верасня — у Гродне, з 10 жніўня — у Маладзечне, з 16-га — у Баранавічах, з 17-га — у Салігорску, з 24-га — у Жодзіне і гэтак далей. Увесь жнівень у буйных універмагах праводзяцца акцыі, якія прадугледжваюць зніжкі і падарункі, — не лянуемся адсочваць іх на сайтах гандлёвых установаў. Буйныя ўнівермагі, дарэчы, маюць перавагу перад маленькімі крамамі: у іх больш магчымасці зніжаць цэны і прапаноўваць дадатковыя зніжкі — рабіць гэта дазваляе велізарны аб'ём іх продажаў. Адпаведна, менавіта ў вялікіх крамах у вас больш шанцаў набыць школьны асартымент па прывабных цэнах. Яны ж звычайна прапаноўваюць праграмы крэдытавання і растэрміновак. Але што датычыцца, напрыклад, карт растэрміновак (накшталт «Халвы»), тут аб эканоміі размова не ідзе. З аднаго боку, мы быццам бы плацім за зборы ў школу «не сваімі» грашыма, з іншага — потым некалькі месяцаў аддаём уласныя сродкі, прычым ужо паспеўшы забыцца, за што. Акрамя таго, нярэдка пры аплаце картамі растэрміновак не дзейнічаюць акцыйныя зніжкі. А вось дысконтныя карты ўнівермагаў — гэта якраз аб скарачэнні выдаткаў на зборы ў школу. Акрамя таго, у буйных універмагах шматдзетным сем'ям і сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, пры прад'яўленні пацвярджальных дакументаў прадугледжаны дадатковыя зніжкі на школьны асартымент: калі ваша сям'я ў адной з гэтых катэгорый, гэта пытанне трэба ўдакладніць, выбіраючы месца для шопінгу.

І яшчэ адна парада ад вопытных мам, якая гучыць так: непасрэдна да Дня ведаў — толькі самае неабходнае. Астатняе дакупляем пазней. У верасні—кастрычніку ажыятаж схлыне, а магазіны знізяць цэны на школьны асартымент да магчымага мінімуму. І, такім чынам, з'явіцца магчымасць набыць таннней тое, што каштавала даражэй у 20-х чыслах жніўня.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# Аддаць сэрца людзям

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

«Дома заўсёды было мноства літаратуры па хірургіі і ўвогуле па медыцыне. Тата дзяліўся з намі сваімі рабочымі гісторыямі, заўсёды з натхненнем і запалам расказваў пра выпадкі, калі цяжкага пацыента ўдалося выратаваць. І з самага ранняга дзяцінства я назірала за шматлікімі кансультацыямі, па якія прыходзілі блізкія і знаёмыя, а бацька ўсім імкнуўся дапамагчы. Тата марыў, каб яго дочкі сталі медыкамі. Мая старэйшая сястра пайшла ў навуку, а я — у медыцыну», — расказвае наша гераіня.

З усмешкай успамінае Алена Віктараўна, як, будучы маленькай, у вёсцы ў бабулі ўдарылася ілбом аб востры крук дзвярэй. Віктар Васільевіч з мужчынскім спакоем зацісну рану і павёз дачку ў мясцовую бальніцу, дзе хірурга не аказалася. Тады бацька ў падрыхтаванай аперацыйнай сам наклаў швы, заспакоіў. Толькі праз гады Алена зразумела, чаго каштавала бацьку, які бачыў сваё дзіця ў крыві, стрымацца і не паказаць хвалявання.



Алена і Станіслаў з бацькам Яўгенам Аляксандравічам.



**Самым складаным у прафесіі Украінец называюць штодзённыя зносіны з людзьмі, якія прыходзяць у бальніцу часам зусім не з пазітыўным настроем.**

Адукацыю яна атрымлівала ў Віцебскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце, скончыла альма-матар з дыпломам урача-тэрапеўта. У Віцебскай абласной клінічнай бальніцы праходзіла інтэрнатуру, тут з 2013 года пачала пісаць свой прафесійны летапіс, як і яе муж Станіслаў — траўматолаг.

У сужэнцаў на дзіва падобныя жыццёвыя гісторыі. Так, напэўна, сышліся зоркі, што іх бацькі працавалі разам. І абое — віртуозы хірургіі. А пазнаёмілася пара ва ўніверсітэце, убачыўшы знаёмыя прозвішчы. Станіслаў таксама з дзяцінства быў уцягнуты ў медыцынскае асяроддзе і таксама выбраў прафесійай ратаванне людзей. Яго маці Ірына Украінец шмат гадоў аддала эпідэміялогіі, цётка Інеса Аляксандраўна працуе ў інфекцыйным аддзяленні бальніцы.

Агульны медыцынскі стаж сям'і Украінец сёння налічвае больш за 160 гадоў. Бацька Станіслава Яўген Аляксандравіч узначальвае хірургічнае аддзяленне, сын — траўматалагічнае, Алена кіруе аддзяленнем гіпербарычнай аксігенацыі. «Наколькі складана быць з сям'ёй і на рабоце, і дома?» — пытаюся я ў гераіні. «Вялікі плюс у тым, што мы не маем дачынення да работы адно аднаго. Нашы кірункі ніяк не перасякаюцца, хіба толькі можам параіцца наконт адміністрацыйных пытанняў, вядзення дакументацыі. Кожны спецыяліст у сваёй вобласці, і гэта вельмі правільна, на маю думку», — разважае Алена Віктараўна.

Аддушынай і, вядома, вынікам шчырага кахання Алены і Станіслава сталі двое сыноў, Косця і Міша. Цяпер хлопчыкі ўжо праяўляюць інтарэс да прафесіі сваіх бацькоў, адзін з любімых заняткаў — слухаць гісторыі аб цікавых здарэннях і шчаслівых выратаваннях, а яшчэ мераць ціск бабулі. Але, прызнаецца Алена, муж бывае дома не так часта, як хацелася б, — складаны графік, дзяжурствы. «Калі б я не бачыла графік свайго бацькі, не была б сама ўрачом, мяне вельмі напружвала б, што ноччу могуць патэлефанаваць і выклікаць мужа на аперацыю. На шчасце, я ўсё разумею і прымаю», — дзеліцца жанчына. Яна змагла растлумачыць і дзецям, што прафесія, якую выбралі бацькі, патрабуе пастаяннай дапамогі людзям у незалежнасці ад часу і выхадных. І малыя гэту ісціну засвоілі выдатна: ведаюць, што пасля напружанага дня бацьку патрэбен час спакою, нават усе гадзіннікі або прадметы, якія выдаюць гукі, з пакоя трэба ўбраць. Маці Алена любіць адпачываць ад работы ў садзе, дзе падчас працы з зямлёй прыходзяць у парадак думкі і супакойваецца душа. І ў такія гадзіны Косця і Міша таксама стараюцца без патрэбы яе не турбаваць.

**Урачы, як і большасць прадстаўнікоў іншых прафесій, людзі прымхлівыя. Так, выходзячы на работу, сужэнцы ні ў якім разе не жадаюць адно аднаму спакойнага дзяжурства.**

Самым складаным у прафесіі Украінец называюць штодзённыя зносіны з людзьмі, якія прыходзяць у бальніцу часам зусім не з пазітыўным настроем. І тыя выпадкі, калі на аперацыйным стале, на вялікі жаль, перамагае смерць. Асабліва ўзрушальнай дагэтуль застаецца дзіцячая. Ад першых падобных выпадкаў Станіслаў адыходзіў тыднямі, успрымаючы кожную трагедыю як асабістую. З часам эмацыянальны фон урача-траўматолага стаў больш трывалым, але некаторыя гісторыі ўсё роўна застаюцца ў памяці надоўга.

Урачы, як і большасць прадстаўнікоў іншых прафесій, людзі прымхлівыя. Так, выходзячы на работу, сужэнцы ні ў якім разе не жадаюць адно аднаму спакойнага дзяжурства. Сказаў так — чакай дзень з незлічонай колькасцю здарэнняў. Ёсць і «сіндром парнага выпадку»: калі паступіў пацыент з невядомымі складанымі сімптомамі, з якімі разбіраецца амаль што кансіліум, праз пэўны прамежак часу зноў паступіць такі ж пацыент, з вялікай верагоднасцю — з той жа хваробай.

**Цяпер хлопчыкі ўжо праяўляюць інтарэс да прафесіі сваіх бацькоў, адзін з любімых заняткаў — слухаць гісторыі аб цікавых здарэннях і шчаслівых выратаваннях, а яшчэ мераць ціск бабулі.**

Па слядах бацькоў цяпер «кансультацыі дома», здараецца, праводзяць Станіслаў і Алена. Выбудоўваць асабістыя граніцы, абмяжоўваючыся рабочым графікам, пара не хоча і не збіраецца. «І сябрам, і знаёмым мы стараемся аказаць дапамогу ў любы час. Мы давалі клятву, гэта наша жыццё. Напэўна, язык не павернецца сказаць: «Прабач, сёння ў мяне выхадны». Часта да мяне звяртаюцца з хваробамі дзяцей, бо не заўсёды назначанае лячэнне правільнае, таму адмовіць нельга», — расказвае Алена Віктараўна.

У вольны час, якога ў сям'і не зусім шмат, яны стараюцца займацца актыўным адпачынкам: ездзіць на экскурсіі, катацца разам на веласіпедах, адпачываць на возеры. Станіслаў доўгі час захапляецца рэстаўрацыяй старой мэблі і разьбой па дрэве, творы мастацтва главы сямейства — вытанчаныя палічкі, шафы, разьбяныя лаўкі — упрыгожваюць інтэр'ер лазні і дома.

На ўсе святы вялікая сям'я Украінец збіраецца разам, гэта абавязковая і нязменная традыцыя. Асабліва важным днём для Алены, Станіслава і Яўгена Аляксандравіча, вядома, з'яўляецца Дзень медыка. «У сувязі з тым, што свята прыходзіцца на лета, мы выбіраем адпачынак на свежым паветры. Віншуем калег, усе сябры нашай сям'і дасылаюць нам віншаванні, як на дзень нараджэння. Гэта свята для нашай дынастыі мае вялікае значэнне», — дзеліцца Алена. Цікава, што Станіслаў нарадзіўся 20 мая, у Дзень траўматолага, таму сужэнцы традыцыйна адзначаюць двайное свята.

Алена Віктараўна і Станіслаў Яўгенавіч разам 16 гадоў, 13 з іх — у шлюбе. Сакрэт сямейнага шчасця, кажа гераіня, заключаецца ва ўзаемаразуменні. «Важна разумець і чуць адно аднаго, — удакладняе яна. — Адчуваць настрой і перажыванні без слоў. Сакрэт шчасця яшчэ і ва ўзаемапавазе, каханні і клопаце».

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота БелТА і з архіва сям'і Украінец.**

## Толькі лічбы

# КОЛЬКІ ВЯСЕЛЛЯЎ І КОЛЬКІ РАЗВОДАЎ?

**Жнівень і верасень — самыя папулярныя месяцы для правядзення вяселляў. А сёлета бум шлюбаў прыпаў на дзень трох васьмёрак — 08.08.2024. Часта казкі завяршаюцца вяселлем. У жыцці ж усё толькі пачынаецца пасля штампа ў пашпарце. І, як сведчыць афіцыйная статыстыка, далёка не ва ўсіх атрымліваецца захаваць сям'ю.**

У мінулым годзе ў нашай краіне было зарэгістравана 56 044 шлюбы, з іх сярод гараджан — 48 224, вяскоўцаў — 7820. Сярэдні ўзрост жаніхоў склаў 28,8 года, а нявест — 26,5. Упершыню ўзялі шлюб 34 992 жанчыны і 36 933 мужчыны. Спецыялісты Нацыянальнага статыстычнага камітэта вывелі агульны каэфіцыент шлюбнасці (на 1000 чалавек насельніцтва) — гэта 6,1, але сярод жыхароў гарадоў ён вышэйшы — 6,7, у вяскоўцаў — 4,0.

Вельмі цікавая статыстыка міжнародных шлюбаў. Замуж за беларускіх мужчын выйшлі 991 грамадзянка Расіі, 152 — Украіны, 38 — Казахстана, 26 — Літвы і 21 грамадзянка Латвіі. Беларускія жанчыны ўзялі шлюб з 992 грамадзянамі Расіі, 116 — Украіны, 87 — Літвы, 73 — Турцыі і з 60 грамадзянамі Туркменістана. Такім чынам, грамадзяне Расіі, Украіны і Літвы папулярныя як шлюбныя партнёры і ў мужчын, і ў жанчын Беларусі. Цікава, што ніводны беларускі мужчына не ажаніўся з грамадзянкай Турцыі і Туркменістана, у той час як прыкметная колькасць нашых жанчын выбрала сабе ў якасці спадарожніка жыцця грамадзян менавіта з гэтых краін. Але важна разумець, што тут акцэнтуецца ўвага менавіта на грамадзянстве, а не на нацыянальнасці чалавека. Прасцей кажучы, грамадзянкай Казахстана можа быць хоць казашка, хоць беларуска.

У той жа час распаліся 33 962 ячэйкі грамадства, сярод якіх 29 392 — сем'і гарадскіх жыхароў, 4570 — сем'і жыхароў сельскай мясцовасці. Агульны каэфіцыент разведзенасці — 3,7, у гараджан ён вышэйшы — 4,1, у вяскоўцаў — 2,3.



Дарэчы, у нашай краіне за апошнія гады склалася практыка заключэння шлюбных дагавораў. Прыкладна 4,5 тысячы сем'яў, якія знаходзяцца ў шлюбе, і пар, якія збіраюцца зарэгістраваць новую ячэйку грамадства, афармляюць такі дакумент. У выпадку скасавання шлюбу ён дапамагае цывілізавана ўрэгуляваць парадак выхавання і ўтрымання дзяцей, а таксама маёмасныя пытанні.

Разводзяцца не толькі маладыя сем'і, але і сем'і з вялікім стажам сумеснага жыцця.

| Працягласць шлюбу (гадоў) | Усяго разводаў | У % ад агульнай колькасці разводаў |
|---|---|---|
| Да 1 года | 1 083 | 3,2 |
| 1–4 | 8 478 | 25,0 |
| 5–9 | 8 868 | 26,1 |
| 10–14 | 6 301 | 18,6 |
| 15–19 | 3 971 | 11,7 |
| 20 і больш | 5 261 | 15,5 |

Як правіла, дзеці перажываюць развод бацькоў значна цяжэй, чым самі дарослыя. Паводле звестак Нацыянальнага статыстычнага камітэта, у суадносінах з агульнай колькасцю разводаў распаліся: 41,1 % сем'яў, у якіх не было дзяцей, 36,9 % сем'яў з адным дзіцем і 21,9 % з двума і больш дзецьмі.

**Маргарыта ДРАЗДОВА.**

# «ЁН ЦЯБЕ ЎЖО ЛЮБІЦЬ...»

## У Бабруйску ёсць установа, якая разам з царквой і дзяржавай ратуе ненароджаныя жыцці

**САЦЫЯЛЬНА-асветніцкі Цэнтр падтрымкі сям'і, мацярынства і дзяцінства «Пакровы» з'явіўся ў Бабруйску 12 гадоў таму. Сям'я без дзяцей не сям'я — сцвярджэнне бясспрэчнае. І дзейнасць установы накіравана на тое, каб абараніць самых бездапаможных, тых, хто яшчэ не нарадзіўся. «Ты яго яшчэ не бачыш, ён цябе ўжо любіць» — гэтыя словы размешчаны на слайдары ўстановы як напамін, перасцярога для тых, хто рашыўся на крайні крок. І ў тым, што 932 жыцці, якія маглі абарвацца ў самым пачатку, сёння радуюць сваіх бацькоў, заслуга менавіта цэнтра. Гэту лічбу можна ўбачыць на сайце ўстановы. А пад ёй — споведзі маці гэтых дзяцей. І яны пераконваюць лепш за любыя аргументы.**









### Дом, дзе жыве радасць

Гэты ярка-блакітнага колеру будынак па вуліцы Спартакаўскай, 1А стаў, лічы, родным домам для многіх бабруйчан. Адны прыходзяць сюды па дапамогу, другія — па поклічы сэрца, валанцёрамі.

**Намеснік дырэктара бабруйскага цэнтра «Пакровы» Крысціна НАВАСЁЛАВА** пачынала тут якраз у якасці валанцёра. Цяпер яна сузаснавальнік і член праўлення Дабрачыннага фонду падтрымкі сям'і, мацярынства і дзяцінства «Пакровы», які працуе ў Мінску. Арганізатары не сталі абмяжоўвацца Бабруйскам, сёння спецыялісты ўстановы працуюць у Магілёве, Мінску, Віцебску, Слуцку, Наваполацку, Клічаве.

— Я прыйшла сюды пасля ўдзелу ў конкурсе «Моладзь за жыццё, маральныя і сямейныя каштоўнасці», — расказвае Крысціна. — Мяне вельмі ўразіла, як тут працуюць з цяжарнымі на перадабортным кансультаванні. Жанчыны, якія збіраліся ісці на аборт, нечакана мянялі сваё рашэнне. А пасля прыходзілі, каб падзякаваць за вельмі важныя ў той сітуацыі словы. Яны нарадзілі і толькі пасля гэтага зразумелі, што маглі страціць. Некаторыя перажылі нават шок. Бо нічога няма лепшага, чым мацярынства, і горшага, чым забойства. Іх, лічы, адвялі ад краю прорвы. На той момант разумення гэтага не было. Быў падман, што вырашыцца праблема. Але гэта няпраўда. З аборту праблемы толькі пачынаюцца. Тут я зразумела, наколькі важную функцыю выконвае цэнтр, і пажадала таксама займацца гэтай справай.

Конкурс «Моладзь за жыццё, маральныя і сямейныя каштоўнасці» ўзнік у Бабруйску ў 2017 годзе, з 2020-га стаў рэспубліканскім. Яго заснавальнікі — Фонд «Пакровы» , Беларуская праваслаўная царква і Міністэрства адукацыі.

— Сёлета на гэты конкурс паступіла 383 заявы з усёй Беларусі, — кажа Крысціна. — Перамаглі 34 праекты. Яны былі адзначаны ў рамках штогадовага рэспубліканскага маладзёжнага форуму «Сэнс, жыццё, будучае». У галіне аховы здароўя другі год рэалізоўваецца праект фонду «Святасць нараджэння», сугучны з расійскім «Святасць мацярынства». Туды прыходзяць маці з малымі, якія кажуць нам: «Дзякуй за тое, што ўратавалі нас ад апошняга кроку. Зусім нядаўна мы хрысцілі нашага маленькага падапечнага, якому выратавалі жыццё. Немагчыма знайсці словы, каб апісаць той стан, які цябе ахоплівае, калі бачыш дзіця, якое магло не нарадзіцца. І колькасць такіх дзетак істотная. У сярэднім мы апякаем 320—340 сем'яў, большасць якіх з Бабруйска.

Сёлета Крысціна стала пераможцай абласнога этапу XVI рэспубліканскага конкурсу «Жанчына года» ў намінацыі «Духоўнасць і культура». Яна прымала ўдзел у стварэнні вучэбна-метадычнага комплексу «Духоўнасць і патрыятызм», які вывучаецца на факультатыўных занятках у 5—6 класах, мае свае аўтарскія праекты. На думку суразмоўніцы, галоўны здабытак грамадства — гэта сям'я і клопат пра яе.

— Мы працуем пры ўстановах аховы здароўя, кансультуем жанчын, якія вырашылі перарваць цяжарнасць, — расказвае Крысціна. — У Мінску і Бабруйску прыём вядуць па тры кабінеты «За жыццё», у Віцебску і Магілёве — па два. У штаце цэнтра ёсць і псіхолагі, і юрысты, і сацыяльныя работнікі. Ён функцыянуе ў цеснай узаемасувязі з царквой і дзяржаўнай уладай. Нашы педагогі працуюць у школах, заключаючы пагадненні з каледжамі, ВНУ. Наогул, цэнтр «Пакровы» ўнікальны, такога, як у нас, няма больш нідзе, нават у Расіі.

### Мост паміж царквой і грамадствам

Ініцыятарам і ідэйным натхняльнікам будаўніцтва цэнтра ў Бабруйску стаў яго дырэктар Андрэй Зубенка. Менавіта дзякуючы яго намаганням з былога сціплага будынка судмедэкспертызы быў зроблены шматфункцыянальны аб'ект, плошча якога ў параўнанні з ранейшымі памерамі павялічылася ў пяць разоў — з 200 квадратных метраў да 1000. Каб убачыць сабе, якім ён быў раней, можна паглядзець на фота ў фае цэнтра. Змены ўражваюць.

Пад адным дахам тут знаходзяцца крызісныя пакоі, спартыўная зала, вучэбныя класы, канферэнц-зала, храм. Цэнтр — як мост паміж царквой і грамадствам. Сям'я мае магчымасць атрымаць бясплатна паслугі псіхолага, юрыста, пагутарыць са святарам. Тут дапамогуць матэрыяльна, дадуць прытулак, адным словам — не кінуць у бядзе. Прычым адразу ж, не адкладваючы на шматабяцальнае «потым». Супрацоўнікі цэнтра жартуюць: «Працуем па схеме «аднаго акна».

Дамавы храм у гонар Пакрова Прасвятой Багародзіцы быў асвечаны якраз на хрысціянскае свята — 21 кастрычніка 2018 года. Тут захоўваецца спіс абраза Прасвятой Багародзіцы «Млекакармільшчыца», якому больш за 200 гадоў. Ён быў перададзены ў Бабруйск манахамі святой гары Афон. Як і іншыя падарункі — часціцы мошчаў святой праведнай Ганны, святога Крыжа Гасподняга, іконы.

Настаяцель храма іерэй Аляксей Палякоў займаецца актыўнай місіянерскай дзейнасцю. Ён узначальвае аддзел па пытаннях сям'і, мацярынства і дзяцінства Бабруйскай епархіі і цалкам паглыблены ў жыццё навучэнскай моладзі. Чытае лекцыі, вядзе духоўныя размовы з прыхаджанамі, апякуе людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

— Цэнтр ствараўся, каб дапамагаць шматдзетным сем'ям, маці-адзіночкам, якія знаходзяцца ў крызіснай сітуацыі і вагаюцца паміж жаданнем рабіць аборт або ратаваць дзіця, — расказвае святар. — Людзі часта кіруюцца фінансавым складнікам, хоць мы аказваем нашым жанчынам і грашовую дапамогу. У нас ёсць рэчавы склад, дзе нашы наведвальнікі могуць атрымаць абутак і адзенне на дзяцей, падлеткаў, людзей старэйшага ўзросту. Хапае добрых людзей, якія ахвяруюць новыя рэчы, часта з этыкеткамі. А яшчэ перадаюць каляскі, дзіцячыя ложкі. Для маламаёмасных сем'яў гэта вельмі важная падтрымка.

Шэсць гадоў таму цэнтр сумесна з аддзелам па справах моладзі Бабруйскай епархіі запусціў праект для людзей з абмежаванымі магчымасцямі з Бабруйска і Бабруйскага раёна. Наведвальнікі аддзялення дзённага знаходжання і суправаджальнага пражывання пры тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ленінскага і Першамайскага раёнаў Бабруйска прыходзяць сюды на заняткі, удзельнічаюць у мерапрыемствах і конкурсах. Штогод для ўдзельнікаў праекта ладзяцца экскурсіі і паломніцкія паездкі па святых, культурна-гістарычных мясцінах Беларусі.

Для дзяцей малодшага і сярэдняга ўзросту пры цэнтры функцыяніруе нядзельная школа, дзе займаюцца больш чым 30 дзяцей. Асаблівая ўвага — дзецям з абмежаванымі магчымасцямі. Айцец Аляксей вядзе з імі духоўныя бяседы, а валанцёры займаюцца з імі фізкультурай. «Чытаем Евангелле, глядзім ролікі, п'ём гарбату, — усміхаецца айцец Аляксей. — У нас дзеці не адчуваюць сябе кінутымі. Яны і ў спорце поспехі робяць. Для іх у цэнтры праводзіцца спартакіяды».

### Бясплатныя гурткі на любы густ

Пры цэнтры функцыянуе шмат дзіцячых гурткоў. Усе на бязвыплатнай аснове, бо з наведвальнікамі працуюць валанцёры. Вялікай папулярнасцю карыстаецца керамічная студыя «Глінка»: дзеці разам з бацькамі займаюцца пад кіраўніцтвам таленавітага майстра Таццяны Яновіч. За грошы дабрачынцаў набыты ганчарны круг, керамічная печ, закупляецца гліна. Таццяна Іванаўна ўзначальвае таксама студыю па выяўленчым мастацтве «Вернісаж». Работамі яе вучняў упрыгожаны вестыбюль і лесвічныя маршы цэнтра. Выхаванцы студыі ўдзельнічаюць у конкурсах дзіцячай творчасці гарадскога, рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўняў. Неадночы запрашалася на ўзнагароджанні ў Маскву і Мінск.

З 2018 года адкрыў свае дзверы клас падрыхтоўкі дзяцей да школы. Выкладчыца Ніна Дубліцэвіч будуе заняткі ў гульнявой форме, каб дзецям было цікава падарожнічаць па краіне ведаў.

У тэатральнай студыі «Благавест» маюць магчымасць займацца дзеці ад 6 да 18 гадоў. Далучыцца да творчасці ім дапамагаюць акцёры Магілёўскага драмтэатра імя В. Дуніна-Марцінкевіча. Двойчы ў год — на Раство і Вялікдзень — адбываюцца справаздачныя канцэрты.

На самых маленькіх разлічана студыя «Музыка з мамай». На сёння ў групе займаюцца больш за дваццаць дзяцей ад 1,5 да 5 гадоў. Разняволіцца малым дапамагае прысутнасць іх маці. Валанцёр Вольга Шурына праводзіць заняткі ў гульнявай форме.

У цэнтры ўсе адносіны будуюцца на аснове поўнага даверу. Напрыклад, тут ёсць вялікая бібліятэка, дзе кнігі выдаюцца за абяцанне вярнуць. Ніякага запісу няма.

### Шчасце ў дзецях

Гурткі, жывыя стасункі, сустрэчы — цэнтр дае магчымасць праводзіць час змястоўна і з карысцю. Сёлета 12-ы раз прайшоў міжнародны фестываль у падтрымку сям'і, мацярынства і дзяцінства «Шчасце ў дзецях», які быў ініцыіраваны цэнтрам і прымеркаваны да Міжнароднага дня сям'і.

— Галоўная яго мэта — духоўнае адраджэнне грамадства, — кажа Крысціна Навасёлава. — На яго пляцоўках беларускія і расійскія эксперты выступаюць за зацвярджэнне традыцыйных сямейных каштоўнасцяў і павышэнне прэстыжу мацярынства і бацькоўства. Фестывальная камунікатыўная пляцоўка «Роля сям'і ў выхаванні дзяцей» рэгулярна праводзіць конкурс дзіцячых малюнкаў «Велікодная радасць». Сёлета паступіла больш чым сто работ. І гэта вельмі добры вынік.

Крысціна не хавае, што нічога так не натхняе, як радасць у вачах людзей, якім атрымалася дапамагчы. У цэнтры працуе ўсяго каля 40 чалавек, але шмат памочнікаў з боку. Нездарма кажуць: маліцеся, і Бог пашле патрэбных людзей. А праз іх прыйдзе і дапамога.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з сайта pokrova.by**

# НЕЗВЫЧАЙНАЕ ПАДАРОЖЖА ПА КУКУРУЗНЫМ ЛАБІРЫНЦЕ

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

***— Даволі шмат людзей у будны дзень. Што ж тады ў выхадныя? І ці можна тут паспытаць кукурузу?***

— Людзі прыязджаюць у будныя дні, каб правесці час са сваімі блізкімі ў больш спакойнай абстаноўцы. У выхадныя дні тут працуюць аніматары, артысты Дзяржынскага Дома культуры, тут пачынаецца сапраўдны хаос! *(Смяецца.)*

Такі лабірынт у Беларусі пакуль адзін. Ніхто яшчэ не адважыўся на падобнае, хоць кукуруза ў нас расце па ўсёй краіне. Дарэчы, яе можна паспытаць і на смак. Мы рэалізоўваем кукурузу нашых фермераў, гэта не тая, якая расце ў лабірынце. Калі скончыцца сезон, мы запускаем у лабірынт нашых коз. Праз тыдзень ад лабірынта застаюцца рожкі ды ножкі.

Пакуль надвор'е дазваляе, радуем людзей. Запрашаем і СМІ, і блогераў. Сёння беларускі турызм актыўна развіваецца, людзі імкнуцца даведацца новае аб нашай краіне. Здавалася б, паўгадзіны язды ад Мінска, а вельмі многія не чулі пра існаванне такой гаспадаркі. Пабываўшы ў нас, яны даведаюцца, чым мы займаемся, пасля чаго прыязджаюць яшчэ. Самы галоўны наш кірунак — вытворчасць казінага малака і прадуктаў з яго. А кукурузны лабірынт — прыемны дадатак. Дзеці радуюцца, а нам прыемна.



Мінчане Руслан і Марына разам з дзецьмі паспяхова прайшлі ўвесь лабірынт.



Маленькая Валерыя адзначае тут свой дзень нараджэння.

***— Акрамя кукурузнага лабірынта, мы бачым тут мноства інтэрактыўных лакацый і жывёл. Ці могуць дзеці як-небудзь узаемадзейнічаць з імі?***

— Мы не прэтэндуем на званне заапарка, проста выставілі некалькі відаў жывёл. Многія падкормліваюць нашых гадаванцаў морквай. У сваю чаргу стараліся вывадзіць не дзікіх жывёл, каб дзеці спакойна маглі зайсці і пагладзіць іх. Напэўна, усіх, за выключэннем нашых гусей *(смяецца)*.

Ёсць у нас і невялікі саламяны лабірынт. Ён прызначаны для самых маленькіх. Старэйшыяператвараюць яго ў паркур, што не вельмі нажадана. Пасля падарожжа па лабірынтах можна адпачыць у паркавай зоне, схавацца ад гарачага летняга сонца ў цені. Там арэлі, гамакі, альтанкі каля возера. Апошнія, як правіла, арандуюць кампаніі людзей, якія хочуць спакойна адпачыць ці адсвяткаваць дзень нараджэння.

У нас ёсць і экскурсійны маршрут на трактары «Беларус». Нашы трактарысты яшчэ і машыністы. Таму толькі па выхадных днях мы ладзім аб'язныя экскурсіі па гаспадарцы з гідам. На фудкорце нашы партнёры працуюць у найбольшы пік — выхадныя дні.

***— Ці змяняюцца лакацыі з году ў год? Імкняцеся прыўнесці нешта новае?***

— Мы не прэтэндуем на абсалют, але стараемся і развіваемся, кожны сезон імкнёмся прыўнесці нешта новае. У мінулым годзе

**Такі лабірынт у Беларусі пакуль адзін. Ніхто яшчэ не адважыўся на падобнае, хоць кукуруза ў нас расце па ўсёй краіне.**

крыху спазніліся выразаць лабірынт, таму ён аказаўся для наведвальнікаў простым. Сёлета лабірынт больш складаны. У сярэднім людзі праходзяць яго за 50—60 хвілін. Што самае цікавае — ёсць аматары, якія прыязджаюць сюды яшчэ з першага сезона.

Увогуле, мы адсочваем колькасць наведвальнікаў. У мінулую нядзелю ўстанавілі рэкорд — толькі за адзін дзень да нас прыехала каля тысячы чалавек, а гэта сапраўды вельмі шмат! Мы нават баяліся, што не справімся, але, тым не менш, усё атрымалася. Мы заўсёды папярэджваем бацькоў, каб яны не пакідалі сваіх маленькіх дзяцей без нагляду. У лабірынце можна згубіцца, асабліва самым маленькім. На шчасце, ніхто не пацярпеў.

Адкрыццё восьмага сезона не было пампезным. Праўда, у той дзень не пашанцавала з надвор'ем. Але, дзякуючы яму ж сёлета мы адкрыліся раней, бо кукуруза вырасла хутка. Будзем працаваць увесь жнівень і вельмі спадзяваемся, што ў верасні надвор'е не падвядзе. Прыязджайце да нас у дзіўнае падарожжа па кукурузным лабірынце, будзем вельмі рады!

## Узняць настрой і не заблукацца

Пасля шчырай размовы з кіраўніком гаспадаркі карэспандэнты «СГ» таксама адправіліся ў незабыўнае падарожжа. Але перад гэтым вырашылі пагутарыць з тымі, хто ўжо прайшоў яго. Так, мінчане Руслан і Марына прыехалі ў парк «Кукуполіс» разам з дзецьмі і сябрамі. Сям'я паспяхова прайшла праз лабірынт, паўдзельнічала ва ўсіх лакацыях і падзяліліся ўражаннямі: «Абышлі абсалютна ўсе лакацыі. У лабірынце знайшлі ўсе дзесяць пячатак, але не скажу, што гэта было проста. На праходжанне лабірынта спатрэбілася прыкладна паўтары гадзіны. Дзецям асабліва спадабаўся замак з сена. Атрымаліся цудоўныя сямейныя фатаграфіі. Вельмі парадаваў вяровачны гарадок. Арэлі, гамакі, зона адпачынку — усё на найвышэйшым узроўні. На беразе возера размешчаны альтанкі з мангаламі. Там можна схавацца ад сонца і пасмажыць шашлыкі. Тут вельмі класныя жывёлы. Дзецям асабліва спадабалася асляня. Усім раю абавязкова наведаць гэтае выдатнае месца».

Наступных суразмоўцаў мы сустрэлі ўжо ў самім лабірынце. Міхаіл прыехаў разам з дачкой Кацярынай і ўнукам Данем ужо другі раз: «Мы самі з Мінска, дабірацца зручна. Дачцэ з унукам тут вельмі падабаецца. А сёлета стала яшчэ лепш, бо з'явіліся новыя лакацыі! Даню вельмі ўразілі козачкі. Наведалі і саму ферму. На выхадных тут асабліва весела, выступаюць артысты. Наш вердыкт — гэта сапраўды выдатнае месца для сямейнага адпачынку».

Працягваючы падарожжа па кукурузным лабірынце, сустракаем новую сям'ю. У парку «Кукуполіс»

**У мінулую нядзелю ўстанавілі рэкорд — толькі за адзін дзень да нас прыехала каля тысячы чалавек, а гэта сапраўды вельмі шмат!**

Кацярына разам з сынам Аляксандрам не ўпершыню. Сёлета яны прыехалі з сябрамі: «Мы прыязджаем сюды кожны год, выбіраем гэтае месца, бо тут усе ўмовы для сямейнага адпачынку. Дарэчы, кожны год з'яўляюцца новыя лакацыі. Летась, напрыклад, не было моста ў цэнтры лабірынта. Калі залезці на яго, убачыш усё вакол, акрамя пячатак, якія неабходна сабраць».

Блукаючы па лабірынце, знаходзім новых спадарожнікаў. Аляксандр і Ірына разам з дачкой Валерыяй прыехалі сюды не проста так. У маленькай прыгажуні дзень нараджэння! «Мы тут упершыню, але нам вельмі падабаецца. Акра-



мя лабірынта і фермы, можна паўдзельнічаць у розных актыўнасцях. Так, напрыклад, мы паспаборнічалі ў трапнасці — пастралялі з рагаткі па фігурках. Дачцэ ж больш спадабаўся лабірынт з сена. Не пашкадавалі, што прыехалі сюды». Валерыя расказала па сакрэце, што ёй падарылі вялізнага аднарога: «Мне вельмі спадабаліся козачкі і трусы. Я пакарміла іх морквай! Для мяне гэта найлепшы падарунак!»

Наступных суразмоўцаў заспелі ўжо на выхадзе з лабірынта. Сяргей і Іна разам з дочкамі Сафіяй і Крысцінай каталіся на вяровачных арэлях: «Мы тут упершыню. Вельмі спадабаўся лабірынт. Ён цікавы і незвычайны. Дзеці былі ў захапленні. Гэта добрае месца для спакойнага сямейнага адпачынку без лішняга шуму».

Дзве Наталлі разам з дзецьмі падкармлівалі гусей. Сяброўкі прыехалі ў «Кукуполіс» упершыню. Што цікава, іх сыноў таксама завуць аднолькава — Аляксандрамі. «Даведаліся пра гэта месца ў інтэрнэце. Шмат станоўчых уражанняў, цудоўны лабірынт, унікальныя лакацыі. Можна спусціцца да возера, пасядзець у альтанцы, пасмажыць шашлыкі. Таксама тут рэалізоўваюць найсмачнейшыя фермерскія прадукты».

Да размовы далучылася другая Наталля: «Чым сёння здзівіш сучасных дзяцей? Тут жа сапраўды ёсць на што паглядзець і чым заняцца. Для хлопчыкаў гэта не падобна на іх звычайнае жыццё! Больш за ўсё нашым дзецям спадабаўся квэст у лабірынце. Яны адразу ж уключыліся ў яго. Ды і гэта сапраўды захапляе: хочацца хутчэй знайсці ўсе пячаткі і выбрацца з лабірынта. Дзецям гэта цікава. Кормім звяркоў. Для дзяцей гэта будзе незабыўнае падарожжа і яркія ўражанні. І калі тут падабаецца 14-гадовым, то што ўжо казаць пра маладзейшых і дарослых?»

Жанчыны адзначылі, што і дабірацца сюды няцяжка — па дарозе размешчаны паказальнікі, якія не дазволяць заблукаць. Ёсць і вялікая паркоўка для аўтамабіляў, што немалаважна.

Наступныя нашы суразмоўцы каштавалі фермерскую прадукцыю: «Адпачываць з дзецьмі на прыродзе цудоўна, бо яны актыўна рухаюцца і дыхаюць свежым паветрам. Маленькім Васілісе і Макару тут вельмі падабаецца. Задума ўдалая, месца адпачынку выдатнае. Прыехалі ўсёй сям'ёй, узялі з сабой нават маленькае дзіця, якому ўсяго тры месяцы. Мы паспяхова прайшлі праз лабірынт — усе адно аднаму дапамагалі. Наогул, ездзім па Беларусі ў пошуках актыўнага адпачынку для ўсёй сям'і, — расказала мама Юлія. — Я б паставіла гэтаму месцу 9 з 10, шкада толькі, што ў будныя дні не працуюць атракцыёны. Мы прыехалі з Барысава. На машыне дабірацца даволі зручна. Мінчанам у гэтым плане пашанцавала: усяго 20 кіламетраў ехаць».

**Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД,**
*Дзяржынскі раён.*

# ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «ЗападХимСервис»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | KB MNP RMN 1500 500 L Кассовый прилавок «Мини», инв. № 31493 | 636,00 | 63,60 | 31,80 |
| 2 | KB-A KB MNP RMN 1500 500 L Кассовый прилавок «Мини» с узким накоп. (7035) метал.метал, в комплекте, инв. № 361 | 636,00 | 63,60 | 31,80 |
| 3 | KB-A KB MNP RMN 1500 500 L Кассовый прилавок «Мини» с узким накоп. (7035) метал.метал, в комплекте, инв. № 363 | 636,00 | 63,60 | 31,80 |
| 4 | KB-A KB MNP RMN 1500 500 P Кассовый прилавок «Мини» с узким накоп. (7035) метал.метал, в комплекте, инв. № 359 | 636,00 | 63,60 | 31,80 |
| 5 | KB-A KB MNP RMN 1500 500 P Кассовый прилавок «Мини» с узким накоп. (7035) метал.метал, в комплекте, инв. № 360 | 636,00 | 63,60 | 31,80 |
| 6 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем метал, в комплекте, инв. № 354 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 7 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем метал, в комплекте, инв. № 357 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 8 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем метал, в комплекте, инв. № 358 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 9 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем метал, в комплекте, инв. № 364 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 10 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем метал, в комплекте, инв. № 365 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 11 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем метал, в комплекте, инв. № 366 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 12 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем метал, в комплекте, инв. № 374 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 13 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем метал, в комплекте, инв. № 3750 | 564,00 | 56,40 | 28,20 |
| 14 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем метал, в комплекте, инв. № 376 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 15 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем метал, в комплекте, инв. № 589 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 16 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем метал, в комплекте, инв. № 590 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 17 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем метал, в комплекте, инв. № 591 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 18 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем метал, в комплекте, инв. № 592 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 19 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем метал, в комплекте, инв. № 599 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 20 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем метал, в комплекте, инв. № 600 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 21 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем метал, в комплекте, инв. № 601 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 22 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем метал, в комплекте, инв. № 602 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 23 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем метал, в комплекте, инв. № 603 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 24 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем метал, в комплекте, инв. № 610 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 25 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем метал, в комплекте, инв. № 611 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 26 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем метал, в комплекте, инв. № 612 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 27 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем метал, в комплекте, инв. № 616 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 28 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем метал, в комплекте, инв. № 618 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 29 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем метал, в комплекте, инв. № 743 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 30 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем метал, в комплекте, инв. № 748 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 31 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем метал, в комплекте, инв. № 749 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 32 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем метал, в комплекте, инв. № 753 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 33 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем метал, в комплекте, инв. № 755 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 34 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем метал, в комплекте, инв. № 759 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 35 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем метал, в комплекте, инв. № 761 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 36 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем метал, в комплекте, инв. № 762 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 37 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем метал, в комплекте, инв. № 764 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 38 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем метал, в комплекте, инв. № 770 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 39 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем металл, инв. № 5521 | 564,00 | 56,40 | 28,20 |
| 40 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем (3020) металл, в комплекте, инв. № 31399 | 564,00 | 56,40 | 28,20 |
| 41 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем (3020) металл, в комплекте, инв. № 31400 | 564,00 | 56,40 | 28,20 |
| 42 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем (3020) металл, в комплекте, инв. № 3871 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 43 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем (3020) металл, в комплекте, инв. № 3872 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 44 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем (3020) металл, в комплекте, инв. № 3873 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 45 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем (3020) металл, в комплекте, инв. № 5063 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 46 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем (3020) металл, в комплекте, инв. № 5118 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 47 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем (3020) металл, в комплекте, инв. № 5119 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 48 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем (3020) металл, в комплекте, инв. № 5120 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 49 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем (3020) металл, в комплекте, инв. № 5131 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 50 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем (3020) металл, в комплекте, инв. № 5132 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 51 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем (3020) металл, в комплекте, инв. № 5182 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 52 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем (3020) металл, в комплекте, инв. № 5183 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 53 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем (3020) металл, в комплекте, инв. № 5184 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 54 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем (3020) металл, в комплекте, инв. № 6050 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 55 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем (3020) металл, в комплекте, инв. № 6051 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 56 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем (3020) металл, в комплекте, инв. № 6062 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 57 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем (3020) металл, в комплекте, инв. № 6063 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 58 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем (3020) металл, в комплекте, инв. № 6522 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 59 | KB-A MM W01 00 00 Кассовый прилавок «Мини» 1500 с узким накопителем металл, в комплекте, инв. № 31558 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 60 | Кондиционер 1U30IS1EAB (S) внешний блок Haier, инв. № 5657; Кондиционер AB60CS1ERA (S) внутренний блок Haier, инв. № 5658 | 3 960,00 | 396,00 | 198,00 |
| 61 | Стеллаж 1200*500*1515 | 240,00 | 24,00 | 12,00 |
| 62 | Стеллаж 1200*500*1515 | 240,00 | 24,00 | 12,00 |
| 63 | Стеллаж 1200*500*1515 | 240,00 | 24,00 | 12,00 |
| 64 | Стеллаж 1200*500*1515 | 240,00 | 24,00 | 12,00 |
| 65 | Стеллаж 1200*500*1515 | 240,00 | 24,00 | 12,00 |
| 66 | Стеллаж 1200*500*1515 | 240,00 | 24,00 | 12,00 |
| 67 | Стеллаж винный (795*447*1295) | 180,00 | 18,00 | 9,00 |
| 68 | Стеллаж винный (795*447*1295) | 180,00 | 18,00 | 9,00 |
| 69 | Стеллаж винный (795*447*1295) | 180,00 | 18,00 | 9,00 |
| 70 | Стеллаж винный (795*447*1295) | 180,00 | 18,00 | 9,00 |
| 71 | Стеллаж винный (800*450*1300) | 180,00 | 18,00 | 9,00 |
| 72 | Стеллаж винный (800*450*1300) | 180,00 | 18,00 | 9,00 |
| 73 | Стеллаж островной 1000*400*1515 | 276,00 | 27,60 | 13,80 |
| 74 | Стеллаж островной 1000*400*1515 | 276,00 | 27,60 | 13,80 |
| 75 | Стеллаж островной 1000*500*1515 | 276,00 | 27,60 | 13,80 |
| 76 | Стеллаж островной 1000*500*1515 | 276,00 | 27,60 | 13,80 |
| 77 | Стеллаж островной 1000*500*1515 | 276,00 | 27,60 | 13,80 |
| 78 | Стеллаж островной 1000*500*1515 | 276,00 | 27,60 | 13,80 |
| 79 | Стеллаж островной 1000*500*1515 | 276,00 | 27,60 | 13,80 |
| 80 | Стеллаж островной 1000*500*1515 | 276,00 | 27,60 | 13,80 |
| 81 | Стеллаж островной 1000*500*1515 | 276,00 | 27,60 | 13,80 |
| 82 | Стеллаж островной 1000*500*1515 | 276,00 | 27,60 | 13,80 |
| 83 | Стеллаж островной 1000*500*1515 | 276,00 | 27,60 | 13,80 |
| 84 | Стеллаж островной 1200*400*1515 | 312,00 | 31,20 | 15,60 |
| 85 | Стеллаж островной 1200*500*1515 | 312,00 | 31,20 | 15,60 |
| 86 | Стеллаж островной 1200*500*1515 | 312,00 | 31,20 | 15,60 |
| 87 | Стеллаж островной 1200*500*1515 | 312,00 | 31,20 | 15,60 |
| 88 | Стеллаж островной 1200*500*1515 | 312,00 | 31,20 | 15,60 |
| 89 | Стеллаж островной 1200*500*1515 | 312,00 | 31,20 | 15,60 |
| 90 | Стеллаж островной 1200*500*1515 | 312,00 | 31,20 | 15,60 |
| 91 | Стол для упаковки 900*500*900 | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 92 | Стол для упаковки 900*500*900 | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 93 | Стол для упаковки 900*500*900 | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 94 | Стол для упаковки 900*500*900 | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 95 | Стол для упаковки 900*900*500 | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 96 | Стол для упаковки 900*900*500 | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 97 | Стол для упаковки 900*900*500 | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 98 | Стол для упаковки 900*900*500 | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 99 | Стол для упаковки товара 900/900/500 | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 100 | Стол для упаковки товаров 900*900*500 | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 101 | Стол для упаковки товаров 900*900*500 | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 102 | Стол для упаковки товаров 900*900*500 | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 103 | Стол распаковочный 900*500*900 | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 104 | Стол распаковочный 900*500*900 | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 105 | Стол распаковочный 900*500*900 | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 106 | Стол распаковочный 900*500*900 | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 107 | Стол распаковочный 900*500*900 | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 108 | Стол распаковочный | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 109 | Стол распаковочный | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 110 | Стол распаковочный | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 111 | Стол распаковочный | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 112 | Стол распаковочный | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 113 | Стол распаковочный | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 114 | Стол упаковочный 900*500*900 | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 115 | Стол упаковочный 900*500*900 | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 116 | Стол упаковочный 900*500*900 | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 117 | Стол упаковочный 900*500*900 | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 118 | Стол упаковочный 900*500*900 | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 119 | Стол упаковочный 900*500*900 | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 120 | Стол упаковочный 900*500*900 | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 121 | Стол упаковочный 900*500*900 | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 122 | Стол упаковочный 900*500*900 | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 123 | Стол упаковочный 900*500*900 | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 124 | Стол упаковочный 900*900*500 | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 125 | Стол упаковочный 900*900*500 | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 126 | Стол упаковочный 900*900*500 | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 127 | Стол упаковочный 900*900*500 | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 128 | Шкаф композитный на 120 позиций, размер 860*2060*425мм | 804,00 | 80,40 | 40,20 |
| 129 | Шкаф композитный на 120 позиций, размер 860*2060*425мм | 804,00 | 80,40 | 40,20 |
| 130 | Шкаф композитный на 120 позиций, размер 860*2060*425мм | 804,00 | 80,40 | 40,20 |
| 131 | Шкаф композитный на 120 позиций, размер 860*2060*425мм | 804,00 | 80,40 | 40,20 |
| 132 | Шкаф композитный на 120 позиций, размер 860*2060*425мм | 804,00 | 80,40 | 40,20 |
| 133 | Шкаф композитный на 120 позиций, размер 860*2060*425мм | 804,00 | 80,40 | 40,20 |
| 134 | Шкаф композитный на 120 позиций, размер 860*2060*425мм | 804,00 | 80,40 | 40,20 |
